ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 35 (682) | Субота, 28 жніўня 1948 года. | Цана 50 кап.

Комуністы — розум, сумленне і сіла народа

З кожным днём усё часцей і магутней гучыць на зямлі светлае, чыстае, грознае слова—комуністы. Пад іх сцягамі мільёны працоўных кітайцаў змагаюцца за сваю будучыню. Комуністам даверыў свой лёс ямат-пакутны народ Грэцыі і сёння з нябачаным гераізмам вядзе барацьбу з грэчаскімі крывавымі рэакцыянерамі і іх амерыканскімі натхніцелямі. Французская комуністычная партыя—першая партыя Францыі. Краіны новай дэмакратыі пад кіраўніцтвам комуністычных партый пачалі будаваць соцыялізм. Таму і шалеюць доларавыя магнаты, і розныя камісіі мундтаў азвярэла цкуюць лепшых сыноў і дочак народа. Яны з-за вугла страляюць у правадыроў рабочага класа. У адказ выбухае перуновы гнеў простых людзей.

Ні цкаваннем, ні турмамі, ні стрэламі не спыніць пераможнага наступу комуністычных ідэй, бо «ўсе дарогі вядуць да комунізма».

Працоўныя ўсяго свету бачыць вялікі прыклад пабудовы соцыялізма ў Совецкім Саюзе. Совецкі народ на чале з вялікай партыяй Леніна — Сталіна ўпэўнена, з небывалым уздымам будуе цяпер комунізм. І мы, яго будаўнікі, ужо бачым ясныя абрысы будучыні. На перадавой лініі грандыёзнага будаўніцтва, як у часы Вялікай Айчыннай вайны на перадавой лініі агню, знаходзяцца верныя сыны бяссмертнай партыі Леніна—Сталіна.

Большэвіцкая партыя, яе кіраўнікі карыстаюцца ў народзе вялікай любоўю, павагай, давер'ем і гэта таму, што комуністы дбаюць перш за ўсё аб грамадскіх інтарэсах, аб шчасці ўсяго народа. Як вядома, нямецка-фашысцкія захопнікі спустошылі Украіну, Беларусь, Малдавію і іншыя рэспублікі і вобласці. Былі разбураны сотні гарадоў з буйнейшымі прадпрыемствамі, дзесяткі тысяч вёсак. Мільёны людзей вымушаны былі пасяліцца ў зямлянках. Але вялікі Сталін сказаў: «Асноўныя задачы новага пяцігадовага плана заключаюцца ў тым, каб аднавіць пацярпеўшыя раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і затым пераўзыйсці гэты ўзровень у больш ці менш значных памерах». А народ ведае: як Сталін сказаў, так і будзе.

І вось наш народ зноў убачыў цудоўнае ператварэнне сталінскіх слоў у справы. Даваенны ўзровень прамысловасці не толькі адноўлен, але і на многа пераўзыйдзены. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца наш Мінск, дзе адноўлены ўсе даваенныя прадпрыемствы і хутка ўступяць у строй такія гіганты, як трактарны і аўтамабільны заводы.

Зямлянкі адыходзяць у нябыт. Уся Беларусь упрыгожылася дзесяткамі і сотнямі тысяч новых дамоў. Толькі за апошнія паўтара гады ў раёнах Совецкага Саюза, якія пацярпелі ад вайны, пабудавана і адноўлена 6.300.000 квадратных метраў жылой плошчы ў гарадах і 433.000 дамоў для калгаснікаў у сёлах.

На гэтыя клопаты большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна совецкі народ адказвае новым патрыятычным уздымам, новымі поспехамі на працоўным фронце. З усіх канцоў краіны ў Крэмль, да любімага правадыра лятуць рапарты аб тым, што калгаснікі вырасцілі ў гэтым годзе небывалы ўраджай. Беларуская ССР датэрмінова, на многа раней, чым у мінулым годзе, выканала і перавыканала дзяржаўны план збожжанарыхтовак і цяпер здае дзяржаве дадатковыя сотні тысяч тон хлеба.

«У цяперашнім уздыме совецкага патрыятызма, — сказаў таварыш Молатаў, — знаходзіць сваё знамянальнае выражэнне ідэйны ўзровень і духоўны рост совецкіх людзей». У гэтым, безумоўна, надзвычайная заслуга большэвікоў, якія штодня выхоўваюць працоўныя масы ў духу комунізма.

Комуністы сёнешняга дня—гэта таленавіцейшыя стратэгі, кіраўнікі і арганізатары, буйнейшыя вучоныя, лепшыя ў свеце палкаводцы.

Комуністы — героі працоўных подзвігаў, нястомныя шукальнікі новых крыніц багацця на карысць свайго народа, найадданейшыя патрыёты Радзімы.

Комуністы — гэта сіла, розум, сумленне, чэсць і слава народа.

Комуніст — сапраўдны герой нашага часу. Ён павінен стаць і ўжо становіцца галоўным героем совецкай літаратуры.

Даўно мінулі тыя дні, калі вобразы большэвікоў падаваліся, як абстрактныя «сейбіты буры», безымянныя камісары, «невядомыя» і г. д. Совецкая літаратура мае значны вопыт у паказе дзеячоў і радавых членаў большэвіцкай партыі. Гэта перш за ўсё — спробы паказаць у кіно, п'есах, раманах, паэмах вобразы геніяльных правадыроў нашай партыі і народа Леніна і Сталіна. Гэтая тэма невычарпальная, яна натхняе і будзе заўсёды натхняць усіх совецкіх пісьменнікаў.

Калі ў братніх літаратурах і, у першую чаргу, у рускай, ужо створаны некаторыя вобразы комуністаў, то наша беларуская літаратура значнымі дасягненнямі ў гэтай справе пахваліцца не можа. Асобныя рысы комуністаў, іх думы, пачуцці, подзвігі ў некаторай меры выяўлены ў паэзіі Пятра Глебкі, Максіма Танка, Петруся Броўкі, у рамане Алеся Стаховіча. Але поўнакроўны вобраз комуніста, з усім багаццем яго унутранага свету, у беларускай літаратуры яшчэ не створаны. Часта комуніста паказваюць схематычна, які толькі і займаецца тым, што ходзіць і прамаўляе да людзей цытаты з перадавых артыкулаў ці агульнавядомыя сказы.

Як станоўчую з'яву нашай літаратуры трэба адзначыць новую таленавітую паэму Аркадзя Куляшова «Новае рэчышча». У ёй паэту ўдалося ў вобразе галоўнага героя пераканаўча і ярка паказаць тыя думы і пачуцці, якія хвалююць радавога комуніста; яго нястомнае імкненне прынесці карысць свайму народу, сваёй дзяржаве; яго вялікую веру ў справу комунізма.

Але такіх твораў у нас вельмі мала. Паказаць у высока таленавітых палымяных творах усю велич ідэй і спраў партыі Леніна—Сталіна, стварыць праўдзівыя і глыбокія вобразы комуністаў — пачэсная і неадкладная задача ўсіх совецкіх пісьменнікаў.

Масква. Крэмль

Старшыні Совета Міністраў Саюза ССР *таварышу СТАЛІНУ Іосіфу Вісарыёнавічу*

Дакладваем Вам, таварыш Сталін, што калгасы, соўгасы і сялянскія гаспадаркі Беларускай ССР датэрмінова, 25 жніўня 1948 года, выканалі дзяржаўны план збожжанарыхтовак. Здана збожжа на 2 мільёны пудоў больш, чым у даваенным 1940 годзе.

Калгасы, соўгасы і сялянскія гаспадаркі рэспублікі ўзялі на сябе абавязацельства здаць дзяржаве звыш плана не менш 2 мільёнаў пудоў збожжа.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі Н. ГУСАРАЎ.

Намеснік Старшыні Совета Міністраў Беларускай ССР К. КІСЯЛЁЎ.

Упаўнаважаны Міністэрства нарыхтовак па Беларускай ССР А. КАРПАЎ.

Міністр сельскай гаспадаркі Беларускай ССР С. КАСЦЮК.

Чаму не выкарыстоўваюцца магчымасці „ПАЛЕСДРУКУ"?

Рыгор НЯХАЙ

Спецыяльны карэспандэнт „Літаратуры і мастацтва"

У цэнтры Гомеля ўзвышаецца прыгожы трохпавярховы будынак. Гэта фабрыка-друкарня «Палесдрук», вядомая сваёй даваеннай прадукцыяй на ўсю Беларусь. Тут друкавалася мастацкая літаратура, падручнікі, брашуры, выраблялася вялікая колькасць сшыткаў.

За даваенны час мы так прызвычаіліся да маркі «Гомель, Совецкая, 1, Палесдрук», што цяпер неяк дзіўна ўзяць кнігу і не сустрэць гэтай маркі. На самой справе, прагледзьце дзесяткі кніг, падручнікаў, брашур, што выйшлі ў свет у пасляваенныя годы, і вы амаль нідзе не сустрэнеце маркі гомельскай друкарні. У чым справа? Што, фабрыка перастала існаваць? Не! Праўда, некаторы час яна сапраўды не існавала. Гэта было ў дні акупацыі, калі нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі яе ўшчэнт. Засталася толькі абгарэлая каробка і груды попелу.

З першага-ж дня вызвалення Гомеля на фабрыцы пачаліся аднаўленчыя работы. «Палесдрук» прышлося ствараць занава—ад вокан і дзвярэй да самых складаных друкарскіх машын. Прайшло нямнога часу, і фабрыка пачала працаваць. Тут адначасова ішоў мантаж абсталявання і вяліся аднаўленчыя работы. Цэх за цэхам уступалі ў строй. Прыбывалі новыя, складаныя машыны, якіх не было да вайны. Рабочыя не толькі асвайвалі іх, але і ўдасканальвалі, паляпшалі іх вытворчую магутнасць. Сёння фабрыка мае такі выгляд, як быццам яна была некранута разбурэннямі. Толькі свежая фарба на вокнах ды часовы дашчаны плот, якім абгароджаны двор, сведчаць аб тым, што тут хутка будзе закончана апошняя чарга аднаўленчых работ.

Паступова, але ўпэўнена расла вытворчая магутнасць фабрыкі. У 1946 годзе яна дала прадукцыі толькі на 325 тысяч рублёў, у 1947 годзе — 601 тысячу, а ў 1948 годзе павінна даць 2 мільёны 785 тысяч. Гэта нямногім менш, чым сярэдняя прадукцыя даваенных гадоў. Пройдзе нямнога часу і «Палесдрук» будзе даваць прадукцыі больш, чым да вайны. Тут усё ёсць для таго, каб не толькі поўнасцю забяспечыць школы рэспублікі сшыткамі, але і даваць значную колькасць кніжнай прадукцыі. Цахі размешчаны так, што адначасова могуць вырабляцца і кнігі і сшыткі. А пераплётны цэх забяспечыць выпуск таго і другога.

«Палесдрук» мае кніжную і газетную ратацыі, друкарскія машыны, новыя лінатыпы, удасканаленыя лінавальныя і швейныя машыны, многа іншай тэхнікі—усё гэта дае права фабрыцы-друкарні застацца адной з асноўных паліграфічных баз рэспублікі.

Але бяда ў тым, што на сёнешні дзень уся гэтая тэхніка «Палесдруку» не выкарыстоўваецца на поўную магутнасць. Кніжная ратацыя, палова лінатыпаў, многа другіх машын не працуюць.

На наша пытанне: «Чаму так здарылася?», дырэктар фабрыкі адказвае:

— Няма заказаў. Нестае кадраў.

Як не дзіўна, але гэта факт: амаль палова ўстаноўленай на фабрыцы тэхнікі не працуе. І гэта ў той час, калі мінская друкарня імя Сталіна не спраўляецца з выкананнем сваіх заказаў.

Па плану 1948 года «Палесдрук» павінен быў выдаць 500 друкаваных аркушаў кніжнай прадукцыі тыражом у 10 тысяч экземпляраў. Няма сумнення, што пры наяўнасці новай тэхнікі гэты план быў-бы выкананы. Але канчаецца трэці квартал 1948 года, а друкарня атрымала заказ толькі на... 70 аркушаў. І то, не ад галоўнага заказчыка—Дзяржаўнага выдавецтва БССР, а ад другіх арганізацый. Выдавецтва заказала «Палесдруку» толькі адзін падручнік—хрэстаматыю па беларускай літаратуры для 10 класа. Прычым, падручнік быў заказаны ў другім квартале бягучага года, а ўжо ён набраны і завёрстаны. Па-сутнасці, падручнік гатовы да друку. Але не друкуецца таму, што Выдавецтва не прадставіла паперы, кардону, калянкору і клішэ. А калі ўсё гэта будзе прадстаўлена—невядома. Між тым, навучальны год пачынаецца.

Цяпер галоўнымі заказчыкамі друкарні з'яўляюцца Міністэрства Асветы БССР і Бланкавыдавецтва. Міністэрства Асветы заказвае сшыткі, дзённікі і класныя журналы, а Бланкавыдавецтва—бланкі. Для выканання гэтых заказаў ні кніжная ратацыя, ні лінатыпы не выкарыстоўваюцца.

Пара паставіць пытанне перад Дзяржаўным выдавецтвам БССР, каб яно ператварыла друкарню «Палесдрук» у сваю другую паліграфічную базу. Можна было-б разгрузіць друкарню імя Сталіна і перанесці выданне многіх кніг у Гомель. Гэта не толькі паскорыла-б выхад літаратуры ў свет, але і дало-б магчымасць выкарыстаць усю тэхніку, якая ўстаноўлена на «Палесдруку». Прыклад з хрэстаматыяй па беларускай літаратуры для 10 класа, якая была набрана літаральна за некалькі дзён, сведчыць, што гомельская друкарня здолее забяспечыць своечасовы выхад у свет новых кніг. Мы ведаем таксама, што «Палесдрук» у часе Вялікай Айчыннай вайны спраўляўся з выданнем цэнтральных газет і часопісаў, кніг, брашур і адозваў. «Палесдрук» мае свае слаўныя традыцыі. Іх неабходна цяпер аднавіць і замацаваць. Рэспубліцы патрэбна многа кніг. Выданне іх мы павінны забяспечыць.

Зразумела, для таго, каб друкарня «Палесдрук» пачала працаваць па-новаму, Кіраўніцтва па справах паліграфіі і выдавецтва пры Совеце Міністраў БССР павінна працаваць таксама па-новаму. Многія вытворчыя і гаспадарчыя пытанні фабрыка не можа вырашыць сваімі сіламі. Тут, у першую чаргу, паўстае пытанне з кадрамі. Справа з падрыхтоўкай кадраў яшчэ адстае ад росту паліграфіі. Нестае высокакваліфікаваных лінатыпістаў, друкароў і рабочых іншых спецыяльнасцей.

Разам з тым, Паліграфкіраўніцтва слаба дапамагае друкарні ў асваенні новай тэхнікі. Зачастую паступаюць новыя машыны некамплектныя або без многіх дэталяў, без якіх машыну нельга пусціць у ход.

Нядаўна на фабрыку былі дасланы паперарэзальныя машыны—поўаўтаматы. 2 месяцы яны прастаялі па прычыне адсутнасці нажоў. Паліграфкіраўніцтва не паклапацілася аб набыцці іх. Нарэшце, фабрыка сваімі сродкамі здабыла па аднаму камплекту нажоў да кожнай машыны. Але гэтага недастаткова. Заступае новая змена рабочых—нажы патрэбна тачыць. У гэты час машыны не працуюць. Паўстае пытанне, чаму фабрыка здолела дастаць нажы, а Паліграфкіраўніцтва не?

Такое-ж становішча атрымалася і з запаснымі апаратамі для швейных машын, з тачыльным станком для наточкі нажоў, з гумавымі валікамі для лінавальных машын. На першы погляд, гэта дробязі. Але без такіх дробязяў машыны не могуць працаваць. Паліграфкіраўніцтва абавязана забяспечыць фабрыку ўсім неабходным, каб яна магла працаваць на поўную магутнасць. Усе гэтыя дэталі да машын можна і неабходна знайсці. Толькі трэба паклапаціцца, як след, па-гаспадарску.

Да гэтага часу не вырашана пытанне і з унутранай транспартыроўкай паперы. Рулоны на 10—15 тон патрэбна падымаць на другі і трэці паверхі. Але пад'ёмнікі на фабрыцы настолькі прымітыўныя, што яны не забяспечваюць самай мінімальнай аховы працы. Тросы часта абрываюцца. Паліграфкіраўніцтва павінна забяспечыць абсталяваннем, патрэбным для механічнай транспартыроўкі паперы.

Ёсць і другія гаспадарчыя пытанні, якія неабходна вырашыць у самы кароткі тэрмін. Неабходна, напрыклад, на Добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы» паскорыць мантаж машын па вытворчасці ролевай паперы, патрэбнай для фабрыкі «Палесдрук», бо некаторыя лінавальныя машыны па выпуску сшыткаў да гэтага часу не выкарыстоўваюцца з прычыны адсутнасці патрэбнай паперы. Паўстала пытанне і ў стварэнні сваёй цынкаграфіі.

Фабрыка-друкарня «Палесдрук» мае вялікія перспектывы. Гэта адна з важнейшых паліграфічных баз рэспублікі. І памяшканне і абсталяванне яе даюць магчымасць штогод павялічваць і пашыраць вытворчасць сшыткаў і кніг. Аднаўленне яе хутка будзе закончана поўнасцю. Цяпер заканчваецца аднаўленне цахоў, будуюцца дамы для рабочых, сталовая, удасканальваецца тэхніка. Выраслі кадры стаханаўцаў. Рабочыя Марчанка, Рудэнка, Касьянаў, Марозаў і другія выконваюць гадавы план за пяць і сем месяцаў. Каляктыў рабочых змагаецца за выкананне і перавыкананне плана. Паміж цахамі разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. У выніку за мінулы год план быў выкананы да 5 лістапада. А ў гэтым годзе за першыя два кварталы на 107,3%. Але бяда ў тым, што за гэтымі лічбамі хаваецца другарадная прадукцыя. А выпуск асноўнай прадукцыі — сшыткаў і кніг пакуль што адстае..

Белпаперазбыту і Міністэрству лясной і папяровай прамысловасці БССР неабходна дамагчыся зладжанасці ў сваёй рабоце, паставіць справу так, каб паперу «Палесдрук» атрымліваў не з Краснакамска або Таліна, а з Добруша, які знаходзіцца недалёка ад Гомеля.

Дзяржаўнаму выдавецтву БССР і Кіраўніцтву па справах паліграфіі і выдавецтваў пры Совеце Міністраў БССР неабходна паклапаціцца аб тым, каб выкарыстаць усю наяўную тэхніку «Палесдруку» на поўную магутнасць. Нельга дапускаць прастою машын з-за адсутнасці заказаў або паперы.

У нас выдаецца многа кніг. Яны будуць выдавацца хутчэй і лепш, калі выдавецтва будзе размяшчаць свае заказы не толькі ў друкарні імя Сталіна, але і ў Гомелі.

На фабрыцы ёсць яшчэ шмат недахопаў. Каляктыў рабочых паспяхова пераадольвае іх і, аднаўляючы фабрыку, намагаецца аднавіць і былую славу «Палесдруку». Але каляктыву рабочых патрэбна дапамога. Патрэбна памятаць, што аднавіўшы былую славу «Палесдруку», мы значна палепшым усю паліграфічную вытворчасць рэспублікі, дадзім сотні тысяч новых сшыткаў і кніг.

Восемнаццаты том Твораў В. І. Леніна

Выйшаў у свет і рассылаецца падпісчыкам восемнаццаты том чацвёртага выдання Твораў В. І. Леніна.

У восемнаццатым томе змешчаны творы В. І. Леніна, напісаныя ім у красавіку 1912—сакавіку 1913 года, у перыяд новага рэвалюцыйнага ўздыму ў Расіі.

Асноўны змест тома складаюць творы, у якіх Ленін дае аналіз соцыяльна-эканамічных і палітычных прычын нарастання новай рэвалюцыі ў Расіі, распрацоўвае тактыку большэвіцкіх партый ва ўмовах новага рэвалюцыйнага ўздыму, выкрывае контррэволюцыйнасць лібяральнай буржуазіі і здрадніцкую ролю ў рабочым руху меншавікоў-ліквідатараў, трацкістаў, упярэдаўцаў.

Вялікая колькасць твораў — «Выбарчая кампанія ў IV Думу і задачы рэволюцыйнай соцыял-дэмакратыі», «Плацформа рэфармістаў і плацформа рэволюцыйных соцыял-дэмакратаў», «Вынікі выбараў», «Да пытання аб некаторых выступленнях рабочых дэпутатаў» і інш.—прысвечана выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу, ацэнцы вынікаў выбараў і дзейнасці соцыял-дэмакратычнай фракцыі.

У томе друкуецца пятнаццаць твораў, якія ўпершыню ўключаюцца ў Творы В. І. Леніна. Гэтыя творы прысвечаны барацьбе з ліквідатарамі і распрацоўцы пытанняў тактыкі большэвіцкай партыі.

У «Пісьме І. В. Сталіну» Ленін дае дырэктыўныя ўказанні большэвікам — дэпутатам IV Думы.

Дакумент «Да пытання аб рабочых дэпутатах у Думе і іх дэкларацыі» з'яўляецца праектам дэкларацыі для соцыял-дэмакратычнай фракцыі IV Думы.

У творах: «Нелягальная партыя і лягальная работа», «Адказ ліквідатарам», «Першапачаткоры постскрыптум да брашуры «Да сучаснага становішча ў РСДРП», «Ці можа быць цяпер асновай рабочага руху лозунг «свабоды кааліцый»?», «Пісьмо да швайцарскіх рабочых», «Аб адносінах да ліквідатарства і аб адзінстве. Тэзісы», «Першапачатковы постскрыптум да артыкула «Развіццё рэволюцыйнай стачкі і вулічных дэманстрацый» В. І. Ленін крытыкуе погляды ліквідатараў і Троцкага, які цалкам падтрымліваў ліквідатараў.

Артыкулы «Кадэты і буйная буржуазія» і «Крах канстытуцыйных ілюзій» прысвечаны выкрыццю думскай тактыкі партыі контррэволюцыйнай буржуазіі — кадэтаў.

У працах «Паўстанні ў арміі і ў флоце», «Рабочыя і «Праўда», «Раней і цяпер» дадзены аналіз уздыму рэволюцыйнага руху і развіцця лягальнага большэвіцкага друку.

У «Паведамленні» «лютаўскай» нарады ЦК РСДРП з партыйнымі работнікамі падведзены вынікі нарады.

У дапамогу вывучаючым творы І. В. Сталіна

Гэтымі днямі Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выпусціла 10-тысячным тыражом на беларускай мове зборнік артыкулаў у дапамогу вывучаючым творы І. В. Сталіна.

У зборнік увайшлі артыкулы П. Паспелава, В. Еўграфава, І. Мінца, М. Іаўчука, В. Кружкова і П. Федасеева.

Зборнік мае 254 старонкі.

Заканчэнне гастроляў тэатра оперы і балета

Каляктыў Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета з 7 па 21 жніўня знаходзіўся на гастролях у Смаленску. Працоўным горада былі паказаны оперы «Яўгені Анегін», «Рыгалета», «Чыё-чыё-сан», «Травіята», і дзве балетныя пастаноўкі — «Лебядзінае возера» і вечар танцаў народаў СССР.

Прыезд опернага тэатра з'явіўся вялікім культурным святам для смалянчан, якія слухалі яго выступленні ў 1938 годзе.

Усе спяктаклі тэатра праходзілі пры поўных зборах. Найбольш цёпла сустракаў глядач спяктаклі «Яўгені Анегін» і «Лебядзінае возера».

22 жніўня каляктыў тэатра наладзіў канцэрт-мітынг на магіле вялікага рускага кампазітара М. І. Глінкі і ўзлажыў на яе вянок.

Народная артыстка БССР Р. Млодзік выканала арыю Антаніды з бессмяротнай оперы Глінкі «Іван Сусанін». Арыю Сусаніна выканаў артыст В. Таланкін. У канцэрце выступілі хор і аркестр тэатра.

24 жніўня адбыўся заключны канцэрт тэатра, у якім удзельнічала лаўрэат Сталінскай прэміі, народная артыстка СССР і БССР Л. П. Александроўская. Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам.

Рэдакцыя газеты «Рабочий Путь» арганізавала вечар сустрэчы грамадскасці Смаленска з артыстамі тэатра.

Альбом „За высокі ўраджай"

Пінская абласная бібліятэка ў дапамогу работнікам сельскай гаспадаркі зрабіла альбом газетных выразак і вітрыну на тэму: «За высокі ўраджай і паспяховую ўборку».

У МТС, калгасы і соўгасы вобласці паслана за апошні час 2.302 кнігі і брашуры палітычнай, мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры. У бліжэйшы час будзе паслана яшчэ каля 3.000 кніг і брашур.

Кіноабслугоўванне насельніцтва

Добра наладжана кіноабслугоўванне насельніцтва ў Лунінецкім раёне, Пінскай вобласці.

Кіноперасоўкі механікаў тт. Дзіяноўскага і Дзеравенчука выканалі план па дэманстрацыі кінофільмаў за ліпень месяц на 150 процантаў. Яны абслужылі за месяц звыш 3.000 чалавек.

Ленінградскі пісьменнік І. Ф. Крат у беларускіх калгаснікаў

Нядаўна ў Беларусь прыехаў вядомы ленінградскі пісьменнік Іван Фёдаравіч Крат.

Пісьменнік збірае матэрыялы, каб напісаць аповесць аб беларускай калгаснай вёсцы. Ён ужо наведаў калгас імя Гастэла, Мінскага раёна, дзе блізка пазнаёміўся з жыццём і дзейнасцю калгаснікаў. Акрамя гэтага пісьменнік мяркуе наведаць калгас «Рассвет», Бабруйскай вобласці, і рад калгасаў на Случчыне.

Кнігі беларускіх пісьменнікаў на рускай мове

Нядаўна ў выдавецтве «Совецкі пісьменнік» выйшла ў перакладзе на рускую мову аўтабіяграфічная аповесць Змітрака Бядулі «У дрымучых лясах».

У перакладзе на рускую мову ў серыі «Школьная бібліятэка» выдаюцца таксама вершы Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Хутка ў Дзяржаўным выдавецтве дзіцячай літаратуры выйдуць у свет зборнік «Беларускія народныя казкі», творы Максіма Танка, Васіля Віткі і Эдзі Агняцвет.

Першая кніга Альманаха „Год XXXI"

У выдавецтве «Совецкі пісьменнік» вышла першая кніга Альманаха «Год XXXI». У яе ўвайшлі аповесці, апавяданні, нарысы і вершы пісьменнікаў і паэтаў, якія пабывалі на буйнейшых будоўлях, прамысловых прадпрыемствах і ў калгасах краіны.

Героям Запарожсталі прысвечана аповесць А. Бека «Цімафей—адкрытае сэрца». Аб слаўных справах яраслаўскіх сельскіх настаўнікаў апавядае Е. Кананенка, В. Гросман дзеліцца ўражаннямі аб паездцы ў Кіргізію.

Літаратура народаў СССР прадстаўлена аповесцю латышскага пісьменніка В. Лаціса «Пачуццё абавязку», паэмай узбекскага паэта Ашырмата «На беразе Кафірнігана», вершам таджыкскага паэта Мірзо Турсун-Задэ «Галубіны палёт».

Рыхтуецца да друку другая кніга Альманаха.

Гастролі Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР

На гастролях у Рызе знаходзіцца Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР.

Тэатр паказаў гледачам спяктаклі «200.000», «Тэўе-малочнік», «Лахаім», «Паўстанне ў гета», «Капрызная нявеста», «Гершэле-Астраполер», «Глыбокія карэнні».

Гэтымі днямі каляктыў тэатра заканчвае работу над спяктаклем «Варта жыць» паводле п'есы А. Губермана. Прэм'ера гэтага спяктакля будзе паказана ў Віцебску, куды тэатр 1 верасня выедзе на гастролі.

г. Рыга. (Наш. кар.).

Абмеркаванне спяктакля „Маладая гвардыя“

Спяктаклем «Маладая гвардыя» адкрыў свае гастролі ў Мінску тэатр імя Ленінскага комсамола БССР. Невыпадкова, што маладзёжны тэатр распачаў свае гастролі іменна гэтым спяктаклем.

28 жніўня ў Тэатральным Аб'яднанні БССР адбылося абмеркаванне пастаноўкі «Маладая гвардыя». Разбор і аналіз спяктакля зрабіў Л. Рахленка.

— Раман «Маладая гвардыя»,— зазначае ён, — меў шмат інсцэніровак. Кожны тэатр па-свойму вырашаў тэму барацьбы з ворагам. Але агульным недахопам многіх пастановак быў слабы паказ кіруючай ролі большэвіцкай партыі дзейнасцю падпольнай комсамольскай арганізацыі ў яе барацьбе з акупантамі.

У новай інсцэніроўцы гэты недахоп выпраўлены. Таму многае ў паказе суровай падпольнай барацьбы залежыць ад ігры актораў, якія павінны раскрыць характары герояў, паказаць на сцэне лепшыя якасці моладзі нашага пакалення, якому давялося быць удзельнікам вялікай бітвы.

Л. Рахленка пераходзіць да характарыстыкі творчай работы актораў. Вобраз Алега Кашавога, комсамольскага арганізатара, надзеленага розумам, душэўнай чыстатой, сумленнасцю стварае артыст Ю. Власаў. Для выяўлення станоўчых якасцяў свайго героя актор знаходзіць адпаведныя сродкі. Яго ігра падкупляе сваёй непасрэднасцю і шчырасцю, асабліва ў сцэне, дзе маладагвардзейцы прысягаюць адпомсціць ворагу. Вобраз Алега Кашавога актору найбольш удаецца выявіць там, дзе ён не стараецца іграць Кашавога, нарачыта падкрэсліваючы яго гераізм, не карыстаецца гатовымі тэатральнымі прыёмамі. У гэтым плане сцэны вечарынкі, уручэння комсамольскага білета Радзіку Юркіну, сцэна, дзе маладыя комсамольцы напоўголаса, каб не пачуў вораг, спяваюць песню аб Маскве,—найбольш запамінальныя ў спяктаклі.

Своеасаблівы і цікавы вобраз Сяргея Цюленіна стварае артыст Г. Волкаў. Знешне Цюленін не адпавядае вобразу, створанаму ў рамане. Але актор умее проста і задушэўна раскрыць пэўныя рысы Цюленіна, умее арганічна спалучыць пачуццё сур'ёзнага з пачуццём гумару, гіроніі. Гэта ў значнай ступені дапамагае больш яркаму раскрыццю характара. Праўда, часамі актор у пагоні за гумарам губляе пачуццё меры і тады гумар, як прыём, губляе сваю падставу, і ператвараецца ў сваю процілегласць. Так атрымалася ў сцэне, калі Цюленін збіраецца ісці на забойства здрадніка Фаміна.

Асобнае месца ў пастаноўцы займае Люба Шаўцова. Яе роля вельмі складаная і, трэба зазначыць, што ў радзе месц артыстка С. Іванова са сваёй роляй спраўляецца. Разам з тым, многія сцэны выпадаюць з ансамбля спяктакля. У сцэне з гітарай С. Іванова перастае жыць сцэнічным жыццём, яна выступае тут проста актрысай, якая ўдала валодае прыёмамі, каб увесці ў зман ворага. Вельмі-ж тэатральная і сцэна развітання Любы з жыццём, калі яна гаворыць: «Бывай, мама. Люба назаўсёды адыходзіць у сырую зямлю». Псіхалагічна, гэта — вельмі складаная сцэна. Тут павінна была-б адчувацца сіла характару Шаўцовай, якая не баіцца смерці, бо верыць у перамогу і адчувае сваю маральную перавагу над ворагам. На самой-жа справе арганічна выявіць гэтыя пачуцці актрыса не здолела.

Улю Громаву іграе артыстка В. Чаркесава. Ясна адно, што вобраза рамантычнай дзяўчыны не атрымалася. Прычыну няўдачы можна вытлумачыць тым, што В. Чаркесава вядзе ігру ў адкрыта-дэкламацыйнай манеры, мяркуючы, што гэтая інтанацыйная прыўзнятасць дасць магчымасць выявіць рамантыку вобраза. У гэтым — асноўная хібнасць ігры актрысы. Рамантыка Громавай бярэ пачатак ва ўзвышаным разуменні нашага прыгожага жыцця, а не ў ілжывай патэтыцы. Таму сцэна перад пакараннем, калі Уля чытае ўрыўкі з «Дэмана», гучыць занадта тэатральна і нежыццёва.

Ні ў якой меры не можа задаволіць гледача і вобраз Валі Борц. Валя Борц (артыстка С. Гурыч)— найбольшая няўдача тэатра.

Адзначаючы добрую ігру З. Келчэўскай — маці Кашавога, К. Айвазоўскай — бабуня Вера, Л. Рахленка гаворыць, што вобразы большэвікоў падпольшчыкаў Працэнкі і Валько тэатру не ўдаліся. Іх высокі інтэлект, упэўненасць у праваце сваёй справы, мужнасць і большэвіцкая цвёрдасць — акторамі не выяўлены. Гэта — самы буйны недахоп спяктакля «Маладая гвардыя».

Варожы лагер пададзены на сцэне ў карыкатурным выглядзе. Немцы, гэта — нейкія дэгенераты, дурні, якіх лёгка можна ашукаць. Выходзіць, што яны не ўяўлялі надта вялікай небяспекі для дзейнасці падпольшчыкаў. А на такім агульным фоне зніжаецца і значнасць подзвігу маладагвардзейцаў. Паказ варожага лагеру патрабуе іншай трактоўкі.

Увогуле спяктакль мае яшчэ шмат істотных недахопаў. Але нават тое, што ўжо зроблена, сведчыць аб значных творчых магчымасцях тэатра.

На трактоўцы вобразаў спыняецца ў сваім выступленні і Ул. Няфёд. Ён зазначае, што спяктакль яшчэ недастаткова хвалюе гледача. І гэта з тае прычыны, што вобразы галоўных герояў не знайшлі глыбокага ўнутранага раскрыцця, а асобныя—нават і зусім не створаны (Валя Борц). Трактоўка Любы Шаўцовай занадта аднабаковая. На сцэне мы яе бачым пераважна, як дзяўчыну вельмі свавольную не толькі ў адносінах з ворагамі, перад якімі яна разыгрывае актрысу, а нават і ва ўзаемаадносінах з сябрамі. Якасць высокай маральнай годнасці совецкай дзяўчыны С. Іванова яшчэ не выявіла.

Сваімі ўражаннямі аб пастаноўцы падзяліўся Я. Міровіч. Асноўную ўвагу прысутных ён спыніў на далейшым павышэнні акторскага майстэрства. Гаворачы аб вельмі шчырай ігры Ю. Власава (Кашавы), Я. Міровіч зазначае, што актору не хапае яшчэ ўмення стварыць характар у яго развіцці. Гэта тым больш неабходна, што ў часе вялікіх падзей характар чалавека развіваецца вельмі хутка, і актор вымушаны паказаць той працэс, у выніку якога юнак ператвараецца ў сталага чалавека. Артыстка З. Чаркесава ў ролі Улі Громавай іграе толькі пачуццё. Няма паказу яе ўзаемаадносін з сябрамі. Вобразы немцаў карыкатурныя. Прычым, трэба заўсёды памятаць, што нават і карыкатура мае нейкія жыццёвыя рысы. У спяктаклі-ж такія рысы адсутнічаюць. Вось чаму пры паказе людзей варожага лагеру не выкрыта звярыная сутнасць ідэалогіі фашызма.

У спрэчках выступілі тт. Мазайскі, Баталін, Рэшымаў, Сяргееў, Падчуфараў, Левін, Гудковіч і Гурыч.

З заключным словам выступіў Л. Рахленка. Ён заклікаў актораў удасканальваць сваё прафесійнае майстэрства, дамагацца глыбокага рэалістычнага раскрыцця вобразаў.

Выданне дзіцячай літаратуры

У гэтым годзе Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выдала ў школьнай серыі 28 назваў кніг агульным тыражом каля 600 тысяч экземпляраў. Сярод іх: «Выбраныя творы» К. Крапівы, «Казкі лірніка» М. Танка, «Сябры», зборнік апавяданняў для дзяцей — А. Якімовіча, «Па лясных сцежках» (нарысы і апавяданні)—В. Вольскага, зборнік вершаў «Мурашка-палашка» — З. Бядулі.

У перакладзе на беларускую мову вышла паэма Г. Леанідзе «Сталін», аповесць Л. Касіля «Дарагія мае хлопчыкі», «Выбраныя вершы і паэмы» Т. Шаўчэнкі, запісы П. Ігнатава «Браты-героі», «Байкі» І. Крылова, «Гумарыстычныя апавяданні» А. Чэхава, вершы В. Маякоўскага «Дзецям».

Хутка выйдуць з друку «Казкі» А. Пушкіна, паэма А. Куляшова «Прыгоды цымбал», выбраныя вершы для дзяцей П. Глебкі—«Размова аб шчасці» і шмат іншай дзіцячай літаратуры.

Кінаабслугоўванне ў час жніва і збожжанарыхтовак

На час жніва і збожжанарыхтовак Мінскае абласное Кіраўніцтва кінафікацыі дадаткова абсталявала 7 кінаперасовак, якія накіраваны ў Заслаўскі, Барысаўскі, Уздзенскі, Бярэзінскі, Дзяржынскі, Смалявіцкі і Чэрвеньскі раёны.

Акрамя гэтага, ў вобласці працуе 41 стацыянарная кіноўстаноўка і 45 кінаперасовак. За час жніва і здачы хлеба дзяржаве праведзена 1707 кіносеансаў, якімі абслужана звыш 165.300 калгаснікаў.

У Дзяржынскі раён накіравана спецыяльная агітмашына. Для сельскага насельніцтва апрача кінасеансаў арганізаваны выступленні брыгад мастацкай самадзейнасці, лекцыі і гутаркі на палітычныя і навуковыя тэмы.

НЯВЫРАШАНАЯ ТЭМА

Фільм „РОДНЫЯ НАПЕВЫ“)*

Фільм-канцэрт «Родныя напевы» пачынаецца з многаабяцаючага надпісу: «У гэтым фільме вы ўбачыце народную творчасць, якая невычэрпнай крыніцай напаўняе мастацтва нашай рэспублікі. Убачыце самадзейнасць і майстроў беларускага тэатра. Пачуеце песню, якая карэннямі ўваходзіць углыб гісторыі і вясёлую прыпеўку, створаную ў наш час. Убачыце старажытны беларускі танец і жыццерадасныя танцы нашых дзён».

Але, прагледзеўшы фільм, мы пераканаліся, што аўтары ўводзяць у зман саміх сябе і гледача.

Фільм «Родныя напевы» не дае ўяўлення аб багацці беларускай народнай творчасці. Не паказвае сувязі асобных песень і танцаў з прыродай, працай і побытам народа. Ён не раскрывае гісторыі ўзнікнення народнай творчасці. У фільме адсутнічае характэрная для нашай рэспублікі тэматыка—партызанская, індустрыяльная, калгасная. Усё гэта—вынік недобрасумленнага, неглыбокага азнаямлення аўтараў фільма з мастацтвам самадзейных калектываў і майстроў тэатра.

Далёка за межамі нашай рэспублікі вядомы Азяршчынскі хор пад кіраўніцтвам калгасніцы Т. Лапацінай. Ён неаднаразова выступаў у Маскве—на сельскагаспадарчай выстаўцы, на дэкадзе беларускага мастацтва, у Крэмлі. Азяршчынскі хор заснаваны сям'ёй сплаўшчыкаў—сялян Лапаціных. Цудоўная асаблівасць гэтага калектыва не выяўлена ў фільме. У фільме не паказана сям'я Лапаціных, у тым ліку і кіраўнік хора Тацяна Карнееўна Лапаціна.

Не дзіўна, што, не ведаючы творчай гісторыі гэтага своеасаблівага самадзейнага калектыва, аўтары фільма не здолелі перадаць найбольш характэрныя песні.

«Марфута» — адна з нямногіх песень,—якая цёпла ўспрымаецца гледачом, але зусім не характэрная для гэтага хора.

Мы не пачулі рэволюцыйную песню сплаўшчыкаў аб «Хлебе значоў», сучасныя прыпеўкі аб пяцігодцы і калгасным жыцці, дзявочыя лірычныя песні.

Усе гэтыя песні не толькі правільна характарызуюць Азяршчынскі калектыў, але разам з тым і адлюстроўваюць характэрныя з'явы жыцця беларускага сялянства.

Хор вёскі Вялікае Падлессе прадстаўлен у фільме песняй «Рэчанька». Гэта бясспрэчна прыгожая песня, вядомая не толькі беларускаму народу. Але яна, разам з другімі, таксама прыгожымі песнямі, дала-б поўнае ўяўленне аб гэтым калектыве, які так-жа вядомы, як і хор Лапацінай.

Сяло Вялікае Падлессе ў час Вялікай Айчыннай вайны было партызанскім.

Калектыў вёскі Вялікае Падлессе, таксама як і Лапацінскі хор прысутнічаюць у фільме толькі ў фанаграфічным запісу, на экране-ж за іх дзейнічаюць выпадковыя людзі.

Не лепш абстаіць справа з паказам у фільме танцавальнага мастацтва Беларусі.

Самадзейны ансамбль Гомельскага клуба чыгуначнікаў імя Леніна прадстаўлены «Чырвонафлоцкім танцам» і танцавальнай карцінкай «Сустрэча пераможцаў». «Чырвонафлоцкі танец» пастаўлены не цікава і ні ў якой меры не характарызуе калектыў. Затое агульнапрызнаны беларускі народны танец «Мяцеліца», які быў прэміраваны на Усесаюзным аглядзе харэаграфічнага самадзейнага мастацтва, у фільм чамусьці не ўвайшоў.

Дрэнна прадстаўлены і выкананы народныя танцы. Найбольш характэрны і папулярны ў Беларусі танец «Лянок» не паказаны. А танцы «Бульба» і «Таўкачыкі» прадстаўлены прымітыўна. Працэсы працы ў гэтых танцах не раскрыты. Вобразнасць выканання многіх танцаў і песень у фільме згублена. Аб песні «Рэчанька» ў выкананні хора Вялікае Падлессе знаўца народных песень Свешнікаў пісаў як аб перлах беларускай народнай песеннай творчасці, вобразна-лірычнай не толькі ў мелодыі, але і ў руху. Ніяк не вяжацца яна з «Рэчанькай» у фільме.

Па прынцыпу ілюстрацыйнасці і спрошчанага разумення вобразнасці паказаны ў фільме амаль усе песні і танцы (танец «Бульба»). Танцавальная карцінка «Сустрэча пераможцаў» перанесена са сцэны ў рэальнае жыццё без пераапрацоўкі.

У прынцыпе аўтары правільна вырашылі адыйсці ад эстраднай пляцоўкі і перанесці канцэртныя нумары ў рэальныя абставіны. У гэтым сэнсе ўдалы і праўдападобны камічны танец у выкананні С. Дрэчына, Шэхава і Б. Розенблат і вальс у выкананні З. Васільевай. Многія-ж песні і танцы выкарыстаны ў фільме няўдала. Перанясенне песень і танцаў на натуру давала магчымасць паказаць усё багацце прыроды Беларусі. Не толькі Азяршчынскі калектыў жыве сярод прыгожай прыроды, але і прырода іншых мясцовасцяў, з якіх паходзяць гурткі, што ўдзельнічаюць у фільме, таксама не паказана. Гэтыя магчымасці пастаноўшчыкамі фільма не былі выкарыстаны. Фон прыроды ў большасці песень і танцаў абстрактны, не звязаны з месцам работы калектываў. Цікавы тыпаж калгасных харыстаў, іх гарнітуры не пераданы. Замест гэтага на ўсім ляжыць пячатка нейкай адцягненай прыгажосці, якая затушоўвае знешнія індывідуальныя асаблівасці кожнага калектыва.

У фільме няма сюжэтнага вобраза, які аб'ядноўваў-бы песні і танцы. Таму ўсе мантажныя сашчапленні атрымаліся знешнімі і фармальнымі. Нам не зразумела, напрыклад, якія адносіны маюць да вакальнага і харэаграфічнага профіля фільма піраміды беларускіх фізкультурнікаў, дастаткова вядомыя гледачу па хранікальных фільмах і часопісах.

Фільм-канцэрт «Родныя напевы» не апраўдаў чаканняў гледача. Яго аўтары павярхоўна падышлі да матэрыялу. Яны абмежаваліся беглым знаёмствам з народнай творчасцю па канцэртах, глыбока не вывучыўшы яго, не пазнаёміўшыся з творчым жыццём калектываў на месцах. Гэта абумовіла асноўныя недахопы і звяло амаль на нішто ідэйна-мастацкую каштоўнасць гэтай цікавай тэмы.

Н. ЛЮБОШЫЦ, кінарэжысёр.

*) Вытворчасць кіностудыі «Беларусьфільм», аўтар сцэнарыя А. Шульман, рэжысёры А. Шульман, С. Сплашноў, апяратар Г. Вдавенкаў, кампазітар С. Палонскі.

* * *

Сталінград. Адноўлены жылы дом па вуліцы Леніна. Памяшканне мае 40 добраабсталяваных кватэр.
Фота А. Макляцова. (фотахроніка ТАСС).

* * *

УЛ. НЯФЁД

„З НАРОДАМ“

Крытык Д. Кальм, які змясціў свой артыкул у газеце «Советское искусство» аб п'есе і спяктаклі «З народам», занадта павярхоўна падышоў да ацэнкі гэтага твора. Д. Кальм, назваўшы артыкул: «Два рашэнні адной тэмы», адразу трапіў у палон уласнай схемы. Параўнанне альбо супроцьстаўленне п'ес «Канстанцін Заслонаў» і «З народам» не можа палегчыць вырашэнне задачы. Такое параўнанне выглядае штучным, таму што абедзве гэтыя п'есы маюць толькі самыя агульныя пункты сутыкнення, накшталт таго, што падзеі адбываюцца прыкладна ў адзін і той-жа час па акупіраванай немцамі совецкай тэрыторыі. Відавочна іменна гэтыя моманты і з'явіліся прычынай таго, што Д. Кальм аб'яднаў п'есы пры іх разглядзе. Але разважаючы такім чынам, можна аб'яднаць разам усё, напісанае аб Вялікай Айчыннай вайне і партызанскім руху.

Мы, магчыма, і не звярнулі-б увагі на такую пастаноўку пытання Д. Кальмам, калі-б ён даў прынцыповую і грунтоўную ацэнку абедзвюм п'есам. Але замест гэтага атрымалася простае супроцьстаўленне «добрага» і «дрэннага» спяктакляў. Прычым, жадаючы ў што-б там ні стала ўмацаваць свой тэзіс, Д. Кальм не заўсёды справядлівы і аб'ектыўны. Напрыклад, у п'есе «З народам» сцэну забойства здрадніка Мігуцкага ў прадапошняй карціне ён адносіць да груба-дэтэктыўных матываў, але не заўважае такіх-жа сцэн у «Заслонаве». Д. Кальм лічыць, што некаторыя вобразы п'есы будуюцца па прынцыпу «шпіён альбо не шпіён» і лічыць гэта даўно вядомымі і «выкарыстанымі эфектамі», але нічога не гаворыць аб такім самым прыёме ў «Заслонаве» (лінія паводзін Бураўчыка), і г. д. і да т. п.

На наш погляд такія разважанні не маюць пад сабой глебы і не могуць нічога ні сцвердзіць, ні абвергнуць.

У імкненні супроцьпаставіць адну п'есу другой, крытык не заўважыў у вобразе Гудовіча нічога станоўчага. Ён нават не зразумеў, навошта Гудовіч хадзіў на сквер і іграў песні, якія з такім хваляваннем слухаў і падтрымліваў народ.

Д. Кальм заўважае: «Мы са здзіўленнем (!) бачым... і даведваемся, што падобнае «хаджэнне ў народ» з'явілася для яго суцяшальнымі зносінамі з суграмадзянамі...»

Чаму «са здзіўленнем» Д. Кальм даведваецца аб гэтым учынку Гудовіча? Няўжо ўчынак Гудовіча сапраўды «няясны» і «двухсэнсоўны»?

Гудовіч не знаходзіць у сабе дастаткова сіл і ўмельства для таго, каб са зброяй у руках распачаць барацьбу з ворагам. Але яму цяжка жыць на адной зямлі з акупантамі. Як совецкі патрыёт ён узнімае свой голас пратэсту. І няхай гэты пратэст стыхійны і няўмелы, але ён для народа не пройдзе бясследна. Хто перажыў страшэнныя выпрабаванні, знаходзячыся ў акупіраваным Мінску, хто бачыў вуліцы горада, палітыя крывёю нявінных ахвяр, хто бачыў, як фашысты ў жывёльным страху перад совецкімі людзьмі бязлітасна распраўляюцца з малейшымі спробамі пратэсту, той ніколі не згодзіцца, што Гудовіч, вышаўшы на сквер і зайграўшы песню «Широка страна моя родная», хацеў у гэтым знайсці «суцяшальныя зносіны з суграмадзянамі». Не, гэта не суцяшэнне. Для таго, каб зрабіць такі ўчынак, трэба быць патрыётам і мець мужнасць. Гэта заклік да пратэсту.

У асобе Гудовіча паказаны чалавек, бясконца адданы совецкаму народу і гатовы на ўсё для дабра народа.

Д. Кальм таксама не заўважыў цэлую галярэю жыццёвых, праўдзівых вобразаў п'есы. Гэтыя вобразы вызначаюцца свежасцю і арыгінальнасцю. Кожны з іх займае сваё месца ў п'есе і не паўтараецца адзін у адным.

Цікава пабудавана ўся сістэма вобразаў п'есы. На самай ніжэйшай ступені стаіць адкрыты вораг Мігуцкі. Ён адразу перайшоў на бок ворага і пачаў актыўна дапамагаць яму. За ім ідзе Шкуранкоў, абываталь, чалавек беспрынцыповы, якому даражэй за ўсё на свеце яго ўласная скура. Беспрынцыповасць прыводзіць яго да здрадніцтва. Ступенню вышэй знаходзіцца Марфа Пятроўна, жанчына абмежаваная, якая жыве чуткамі і плёткамі, адным словам, мяшчанка. Але ў яе ёсць ужо свае прынцыпы. Як-бы там ні было, а совецкая ўлада для яе дарагая і яна не прамяняе гэтую ўладу ні на якую іншую. Яна разумее, што Гудовіч гэта таленавіты чалавек, што ён многа зрабіў для народа. Таму яна гатова на ўсё, дзеля таго, каб захаваць жыццё гэтаму чалавеку. Вось чаму, дарэчы, яна так лёгка папалася на хітрую правакацыю Мігуцкага і, не жадаючы таго, ледзь не загубіла Гудовіча.

Глыбока драматычны вобраз Броні. Броня—сапраўдны совецкі чалавек-патрыёт. Ненавідзячы акупантаў, Броня імкнецца зрабіць усё, што ў яе сілах, для свайго народа, спрабуе знайсці сваё месца ў барацьбе і знаходзіць яго ў тым, каб выратаваць для народа Гудовіча. Яна вельмі высока цэніць талент Гудовіча і калі-б было патрэбна, яна не задумваючыся памерла-б за яго. Броня ахоплена страхам за жыццё Гудовіча. І толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што баючыся правакацыі, яна прымае Юлю за правакатара.

Ступенню вышэй стаіць Гудовіч, які бачыць свой абавязак у служэнні народу. Сістэму вобразаў замыкаюць партызаны—Юля, Максіменя і другія, якія актыўна змагаюцца супроць ворагаў.

Пераканаўча вышісаны вобразы ворагаў і, у першую чаргу, вобраз афіцэра-гестапаўца Шуфта. Усе гэтыя вобразы настолькі яркія, выразныя і індывідуалізаваныя, што не застаецца ніякага сумнення ў іх жыццёвасці. Аб вобразах п'есы «З народам» якраз менш за ўсё можна сказаць, што яны надуманыя або традыцыйныя.

А калі да гэтага дадаць яскравую вострую мову, то мы прыдзем да вываду, што К. Крапіва напісаў не толькі цікавую, але і жыццёва праўдзівую п'есу.

Д. Кальм не заўважыў у п'есе нічога станоўчага, ён гаворыць толькі аб недахопах. Але недахопы, якія ёсць у п'есе, ускрыты ім няправільна.

Прыкладна тое-ж самае выказала крытык Л. Жукава на абмеркаванні спяктакля тэатра імя Я. Купалы на Усерасійскім Тэатральным Аб'яднанні. Аспрэчваючы трактоўку некаторых вобразаў п'есы, Л. Жукава абвінавачвае аўтара ў паўтарэнні старых сцэнічных прыёмаў і тут-жа прыводзіць такія прыклады, якія якраз сведчаць аб адваротным. Л. Жукава, напрыклад, карыстаючыся старымі схемамі, радзіць аўтару зрабіць Марфу Пятроўну адмоўным персанажам, таму што тады яна «жанрава была-б цікавая» (!?). А вобраз Юлі Л. Жукава радзіць іграць «больш спрошчана», «у плане больш дакладных яе комсамольскіх адносін да жыцця». Вось і выходзіць, што Л. Жукава штурхае аўтара на шлях схематычнага паказу жыцця.

Вельмі шкада, што некаторыя крытыкі (Л. Літвінаў, Я. Рамановіч і інш.) пайшлі следам за Д. Кальмам і Л. Жукавай і некрытычна ўспрынялі іх няправільныя разважанні.

У сваім артыкуле Д. Кальм кідае фразу аб тым, што «перад намі не сапраўднае жыццё, а тэатральнае прадстаўленне», створанае фантазіяй аўтара і тэатра.

Калі-б у гэтым была неабходнасць, то можна было-б вельмі лёгка дакумянтальна даказаць, што ўсе асноўныя галоўныя эпізоды і падзеі п'есы «З народам» спісаны з сапраўднасці, што цэнтральныя персанажы п'есы маюць правобразы ў жыцці.

Але нам на гэта могуць сказаць, што не ўсё тое, што бывае ў жыцці трэба цягнуць на сцэну. Вядома, усё залежыць ад таго, як аўтару ўдасца абагуліць, тыпізаваць факты. Вось аб гэтым трэба было гаварыць Д. Кальму, а не сцвярджаць, што так не бывае ў жыцці. Мы перакананы, што падзеі і вобразы, паказаныя ў п'есе «З народам», вельмі жыццёвыя і праўдзівыя. І разам з тым, пасля прачытання гэтай п'есы або прагляду яе на сцэне, у нас застаецца некаторае пачуццё незадаволенасці. У чым-жа прычына гэтага?

Нам здаецца, што аўтар п'есы «З народам» К. Крапіва занадта аб'ектыўны, натуралістычна падышоў да разгляду цэнтральнага вобраза п'есы—Гудовіча і таму гэты вобраз не атрымаў тыповага абагульнення.

... Ужо больш за год ідзе крывапралітная вайна. У гэты час уся Беларусь ахоплена ўсенародным партызанскім рухам, і ўжо паспелі праславіцца такія героі, як Заслонаў і многія другія. Што-ж робіць у гэты час лепшы кампазітар Беларусі, а, значыць, лепшы прадстаўнік совецкай інтэлігенцыі—Гудовіч?

Ён толькі-толькі пачаў задумвацца аб тым, што-ж яму рабіць: «Мы са сваімі марамі замкнуліся ў сваёй шкарлупе. Народ не толькі марыць, але і змагаецца. І мы павінны яму дапамагаць чым можам. Я ўжо сам думаў пра гэта».

Толькі пасля спрэчкі са Шкуранковым Гудовіч пачынае дзейнічаць. Ён бярэ скрыпку, ідзе на сквер, пачынае іграць песні, якія ў слухачоў абуджаюць высакародныя пачуцці, пачуцці нянавісці да акупантаў. Ва ўмовах акупацыі і страшэннага тэрору гэта смелы ўчынак. Ён уздымае Гудовіча ў вачах гледача. Але, на жаль, аўтар даў Гудовічу занадта мала дзеянняў.

Гудовіч мала выяўляе актыўнасці, каб знайсці правільны і найбольш дзейсны шлях барацьбы з ворагам.

Такім чынам, за ўвесь час Гудовіч робіць два актыўныя ўчынкі—іграе на скверы і згаджаецца пайсці да партызан, каб потым паляцець у Маскву.

Якая-ж думка сцвярджаецца вобразам Гудовіча? Гэта думка аб тым, што совецкі інтэлігент Гудовіч у цяжкіх умовах нямецкай акупацыі не здрадзіў Радзіме, не паддаўся на правакацыю ворагаў і здраднікаў, знайшоў у сабе мужнасць і сілы пайсці да партызан; адным словам, сцвярджаецца думка аб тым, што Гудовіч выстаяў. Але-ж, няўжо хтонебудзь сумняваўся ў гэтых якасцях совецкай інтэлігенцыі? Усё гэта само сабой зразумела. Але выстаяць і перамагчы гэта далёка не адно і тое-ж. Гудовіч мала зрабіў для перамогі народа. Можна паверыць, што прыляцеўшы ў Маскву Гудовіч, як кампазітар, зробіць вялікі ўклад у справу перамогі, але аб гэтым можна толькі здагадацца.

Аўтар п'есы можа не без падставы сказаць, што ён паказаў пажылага чалавека, інтэлігента, які можа служыць народу толькі з дапамогай сваёй прафесіі і не патрэбна даваць яму ў рукі аўтамат, што для такога чалавека, як Гудовіч, ужо многа нават і таго, што ён зрабіў (маецца на ўвазе выхад на сквер і ўход да партызан). Усё гэта правільна. Але будзе дарэчы спытаць, а чаму навучыцца глядач на прыкладзе паводзін Гудовіча? Стойкасці, умельству мужна пераносіць усе ўдары лёсу? Так. Але толькі не барацьбе.

К. Крапіва, відавочна, лічыў, што залішняя актывізацыя вобраза магла зрабіць яго непраўдзівым, надуманым. Але наўрад ці гэта правільна. Задача была ў тым, каб знайсці такія мастацкія сродкі, якія-б зрабілі вобраз Гудовіча поўнацэнным, г. зн. такія, якія-б вучылі совецкага гледача актыўнай барацьбе за правую справу. І тут няма чаго было баяцца папроку ў тэндэнцыйнасці, у тым, што актыўная барацьба парушыла-б цэласны вобраз Гудовіча і зрабіла-б яго надуманым. Наадварот, у такім разе ён стаў-бы больш пераканаўчым, таму што ў ім выявіліся-б тыповыя якасці совецкіх людзей і, у прыватнасці, совецкай інтэлігенцыі. Нам-жа вядомы шматлікія прыклады актыўнага ўдзелу совецкай інтэлігенцыі ў агульнай барацьбе.

Вось чаму мы лічым, што вобраз Гудовіча, не гледзячы на цікавае і шмат у чым удалае вырашэнне, застаўся незавершаным. Пакуль ён—прыватны выпадак, а не тыповая з'ява.

Дарэчы, аб назве п'есы. Нам здаецца, што яна не зусім удалая. Ужо самой назвай нібы ставіцца пытанне—з кім пойдзе Гудовіч, а значыць, інтэлігенцыя, з народам альбо супроць народа. І даецца адказ—з народам. Але-ж совецкая інтэлігенцыя з'яўляецца неад'емнай часткай народа.

Дададзім яшчэ, што Гудовіч значна выйграў-бы ў вачах гледача, калі-б ён супроцьстаўляўся Шкуранкову не толькі, як патрыёт, але і як вялікі мастак, у той час, як выкрыццё Шкуранкова павінна ісці і па ідэйнай лініі і па лініі творчай, як мастака, які не ў стане стварыць сапраўдныя творы для народа.

Нам здаецца, што аўтар і тэатр імя Я. Купалы, на сцэне якога паставлены гэты твор, пры жаданні здолеюць значна палепшыць п'есу і спяктакль «З народам». А неабходнасць у гэтым ёсць, таму што п'еса шмат у чым уяўляе сабой цікавы твор на мала яшчэ распрацаваную тэму ў тэатры—тэму аб ролі совецкай інтэлігенцыі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Творы да 30-годдзя БССР

Аркадзь КУЛЯШОЎ

НОВАЕ РЭЧЫШЧА

(Урывак з паэмы)

* * *

1.

От яна і Пятлянка-рака.
Праязджаю Пятлянку.
Да прараба да Шайпака
Я прыехаў на ранку.

Я іду ў яго дом не гасцём:
Тут мне ўсё незнаёма.
Першы раз я нясу ў яго дом
Свае рэчы, вядома.
Першы раз бачу я гэты кут,
Злажу ў месцы, у гэтым.
З Шайпаком гідрастанцыю тут
Будаваць будзем летам.
Справы нашыя, ведаю сам,
Стрэчы нашай чакаюць.
Толькі я не адбіў тэлеграм—
От і не сустракаюць.
Не адбіў, і—такое бяды—
І без іх давялі сюды
Незнаёмыя сцежкі —
Дзе машынай, дзе пешкі.
Сонца толькі ўзыйшло над ляском.
Ранавата крыху—
Спіць прараб, мусіць, моцным сном.
Я на ганак з ручным багажом
Узыходжу паціху.
Сонца грэе кацёнка за шклом,
Свецяць шыбы гасцінна.

Грукачу...
Адчыняе ў дом
Дзверы мне дзяўчына.
Я пытаю, ці дома Шайпак.

— Як?..
— Няма яго дома.
Не прадбачыў я гэта ніяк...

— Вы да бацькі на практыку?
— Так...
— З інстытута?
— Вядома.

— Бацька мой гаварыў мне
пра вас...
Ён чакаў вас. Заходзьце да нас.

Маім рэчам адведзены кут
За сцяной у бакоўцы.
Дзе-ж Шайпак? Няма яго тут,
Ён — у камандыроўцы.
— А надоўга? На колькі дзён?
— Дні на тры. На чатыры...
Як гасцю ўжо, мне клопат відзён:
Шчыры ён, ці не шчыры.
Шчыры клопат—каму не міл?
Сіл пярэчыць не маю:
Па загаду дарожны пыл
З вопраткі вытрасаю.
Па загаду змываць іду
Пыл, загар, — не пярэчу.
Лье яна мне на рукі ваду —
Мыю твар,—не пярэчу.

Я выконваць усё ёй гатоў,
На'т умыцца яшчэ раз.
Нам не сумна.
У нас да размоў,
Да цікавых для нас размоў,
Ёсць агульны інтэрас.
Пра вучобу цяпер у яе
Мары ўсё—выпускніца;
Перад ёй у красе паўстае
Горад той, што грыміць, што пяе,
Што начамі ёй сніцца.
Ёй пра горад ды пра інстытут
Распытаць цікава.
Мне-ж пра ўсё, што робіцца тут
Знаць цікава,
Вядомая справа...

— Дзе стаяць будзе станцыя ў вас?
Можа пройдземся з намі ў калгас,
Калі часу не шкода?

Па пытанню і гэтаму ў нас
Згода поўная... У добры час:
— Можа пройдземся?
Згода?
— Згода...

Дзве вярсты і яшчэ дзве вярсты—
Лесавая дарога.
Мы згадзіліся ўжо на ты
Зваць адзін другога.
Так лягчэй на дарозе лясной
Пні мінаць і калоды.
Можа крочым і тут мы з ёй
Па шляху да згоды.
Можа блізка і тут яна
Так, што можна ўбачыць.
Можа згода—вунь тая сасна,
Што на ўзгорку маячыць.
Можа будзем ісці мы пад ёй
І не знаць, як заўсёды,
Што праходзім мы не пад сасной,
А пад сховамі згоды.
Хто нам скажа, што гэта яна.
Сцежка міма віецца...
І адна і другая сасна
Убаку застаецца.

Лёгка нам ісці і мінаць
Пні, кусты ды палянкі
На тых сцежках, якія ляжаць
Уздоўж рэчкі Пятлянкі.

2.

Мы прышлі.
Скрозь бярвенне відаць,
Сваі ў засені граба.

Будзем станцыю тут будаваць
Па праекту прараба.
І рабочы настрой,
Неспакой
Авалодвае мною:
Што рабіць нам з ракой?
Што з вадою?

Хто Пятлянкаю рэчку назваў—
Нецікава,
Хто яе, як стварав,
Папятляў
Тут і ўлева, і ўправа?
Робіць петлі рака
З хмызняка, з лазняка
Невясёла,
Аж пад самы пад дом Шайпака
Выгінаючы кола.
З горкі, як на далоні відна
Мне яе дарога:
Круг зрабіўшы, бяжыць яна
Зноў да месца старога.
Колькі лішніх тут зроблена вёрст,
Кіламетраў?..

А ўсяго—каб пусцілі напрост—
Трыста метраў.
Што каб рэчцы прарыць новы ход?
Разважаю—
Колькі дасць ён выгод, невыгод—
Падлічаю...
Горку я аглядаю: а што
За яна, што за глеба?

Пракапаць-бы ўсяго метраў сто—
Больш не трэба...
А далей—роў сыходзіць уніз,
Пад гарою,
А над ім арахоўнік навіс,
Нібы ўжо над вадою,—
З двух бакоў для ракі берагі
Травяныя.
А далей? Шлях вядомы—лугі
Заліўныя.
Колькі-ж рэчцы пятляць і кружыць
Па жаданню прыроды?
А ці нельга вось так і зрабіць:
Просты ход ёй праз горку прарыць,
Рэчку рэчышчам новым пусціць
Назаўсёды?..
Каб па-новаму рэчка цякла
Для людскога дабра, для святла,
Каб пятляць не пятляла,
Каб турбіны круціла яна,
Каб з цямна да відна,
Каб з відна да цямна
Не сціхала,
Святло вырабляла?..

З лазняка, з хмызняка
Робіць петлі рака
Па-старому.

З нецярплівасцю Шайпака
Я чакаю дадому.
З Зосяй—гэтак дачку яго зваць—
Ходзім полем і гаем,
Берагі, лугі, сенажаць,
Грэблю, гаць
Аглядаем.
Я вясёлым сцяжынкам рад—
Тройчы высах і вымак.
Быццам з ёй мы прымаем парад
Каласоў і травінак.
Колькі дружных прайшло палкоў,
Рот пратупала міма?

Толькі дзе-б я не быў, не ішоў,
Тая горка, той роў—
У мяне прад вачыма.
Мне здавалася: дзе-б не ішлі,
Хоць праз нетры сасновыя,
Нас не сцежкі вялі,
А ўсё рэчышчы:
новыя,
новыя.
Быццам з ёй па сцяжынцы такой
Мы шумлівай вадой
Беглі,
гучна гамонячы,
Міма новых кустоў
Новым рэчышчам слоў
Весялосць сваю гонячы.
Поўны новых надзей,
Мы не так, як раней,
Беглі полем, дубровяю.
І напярэдзе ў нас—
Новы шлях,
новы час,
Справы—
новыя...

3.

Каля ганку рака
Петлі ўе з лазняка,
З хмызняка
Па-старому...
Прычакаў Шайпака
Я, нарэшце, дадому.
На машыне пад дом падкаціў
гаспадар,
Разам з ім—сакратар
Райкому.
. . . . . .
Тут прарабам Шайпак працаваў
да вайны,
Дваццаць год і масты будаваў
і млыны...
Загрымела вайна,
Чорны дзень надыйшоў
Для яго, для ягоных
Мастоў і млыноў.
Хіба бачыць прыемна
Прарабу было,
Як праз мост яго
Немцы ўязджалі ў сяло?
Хіба слухаць прыемна
Было Шайпаку,
Як малолі млыны яго
Немцам муку?
Лепш пусціў-бы з агнём
сваю працу да хмар.
Ён пакінуў свой дом,
ён падаўся ў гушчар.

Стрэўся там з Шайпаком
першы раз сакратар.
Сакратар не распытваў,
Чаго ён прышоў.—
Гэта ўсё
Зразумела было і без слоў.
Гэта ўсё расказаў
шум дажджу, ветру свіст,
Дуб, які іх схаваў
пад свой дах, пад свой ліст.

— Комуніст?—сакратар запытаў.
— Комуніст.

Аўтаматы пад дрэвам
Ляглі, як сябры.
Смела ўдвух запалілі
Цяпло ў гушчары.
Быў з іх кожны
Сустрэчы даверліва рад:
Комуніст комуністу—
Як брату брат.
Хай іх покуль што мала —
Няхай яны ўдвух,
Ды ўжо імі прыведзена
Полымя ў рух.
Ды ўжо кінулі
Полымя ўгору яны,
Спяць ужо, як салдаты —
Спіна да спіны.
— Комуніст?
— Комуніст...—як прысягу
далі.
Тут — іх дом,
тут — райком,
месца іх на зямлі.
Пушча ўправа і ўлева —
іх месца, іх дом,
А пад сховамі дрэва
працуе райком.
Пень шырокі — іх стол,
рэха — іх тэлефон.
Немаленькі навокал
ім належыць раён.
І, здаецца, не дзятлы,
а ўжо друкары
Друкавалі іх заклік
на лепшай кары.
Мужны заклік райкома —
Радзімы загад!

Сто штыхоў ужо меў
Цераз месяц атрад.
І нямала Шайпак
Рэк наведаў і сёл,
Пад масты пад свае
Падкладаючы тол.
А прыходзіў з задання —
спаць клаўся ў кустах,
Уздыхаў аж да рання
па быўшых мастах.
Па мастах, па млынах —
Працы доўгіх гадоў:
— Хіба я па сабе
Не пакіну слядоў?
Марыў ён перад самым
Пачаткам вайны
Будаваць гідрастанцыі ўжо —
Не млыны.

Зноў забытая мара
У ім ажыла,
Зноў памкнулася
Сэрца яго да святла.
І рашыў будаваць
Неспакойны салдат
Гідрастанцыю
На пяцьдзесят кілават.
Ён і месца абраў,
Дзе-б стаяла яна —
На Пятлянцы,
На месцы былога млына.
Ён збудуе —
Хай скончыцца толькі вайна.
Ён у станцыю ўсё
Сваё ўмельства ўкладзе,
Каб стаяла, як лялька,
Яна пры вадзе.
Каб была збудавана
яна для патрэб,
Зерне каб сартавала,
малаціла хлеб.
Каб з яе і ў сяўбе
карыстаўся калгас.
Збудаваў каб сабе
ён яе на ўвесь час.
Сто гадоў каб магла
сартаваць, малаціць,
Каб хапала святла
вокны ёй запаліць.
Каб відны былі ў ёй,
нібы ў кроплі малой,
Днепрабуды
радзімы вялікай усёй.

Што-ж? Вайна адгрымела,
і можа цяпер
Здзейсніць смела
прараб свой даўнейшы намер.
Спраўдзіць мару, —
Каб станцыяй стала яна
На Пятлянцы,
На месцы былога млына.
. . . . . .

4.

Нас знаёміла Зося
і ўсіх нас вяла,
Як пры стрэчах вялося,
у дом, да стала.

Хутка гутарка
Блізкіх кранулася тэм,
Справы той,
Што для ўсіх нас цікава.
— Значыць, хутка пачнем буда-
вацца?
— Пачнем!
— Пабудуем?
— Вядомая справа.
— Пяцьдзесят кілават
Гэта, праўда, няшмат,—
Шкадаваў сакратар асцярожна.
— Больш не можна ніяк, —
Шкадаваў і Шайпак.
Але тут я не вытрымаў:
— Можна!..
Можна станцыі моц павялічыць!
— На шмат!

— І на сто кілават,
І на сто пяцьдзесят.

— Што за дзіўная рэч яшчэ, —
Цяжка ўявіць...

Трэба новае рэчышча
Рэчцы прарыць.

— Тут патрэбны разлікі,
Не толькі запал...

— Пракапаем глыбокі
Праз горку канал.
— А ці будзе трывалы ён
У берагах?..

— Забрукуем канал мы
Каменнем, як шлях.
— На такія выдаткі
Ці пойдзе калгас...

— А хіба на Пятлянцы
Адзін ён у нас?
Выйдуць дружнай сям'ёю
калгасы...

Аднак,
Пагадзіцца са мною
не можа Шайпак.
Пагадзіцца са мною
не можа прараб,
Ён за рэчышча тое
старое, дзе граб.

Ён упэўнены, — спрэчак
Са мной не вядзе, —
Што праект мой не будзе
Прыняты нідзе.
— Нерэальная справа, —
Рашыў гаспадар.
Але думкі інакшае
Быў сакратар:
— Я-б хацеў прывітаць
з перамогаю вас...
Ён спяшаўся, відаць,
у суседні калгас.
Гаварыў, захапляўся,
на ганак ішоў.
— Мой праект,—я прызнаўся, —
яшчэ не гатоў.
У машыну садзіўся,
пытаўся ў мяне:
Дзе радзіўся, вучыўся,
партыйны, ці не?
Падтрымаць мяне — стала
паабяцаў.
І паехаў. Нямала
было ў яго спраў.

... Плыў далёкі дымок
З палявых каляін...

Я надоўга ў бакоўцы
Замкнуўся адзін.
Мне — сядзець над праектам
І днём і ўначы.
Я павінен да раніцы
Перамагчы.
— Комуніст? — Комуніст. —
І адказам такім
Шмат чаго гаварыў я
Сабе і другім.
Комуніст не ахвочы
спакою сабе,
Дні і ночы
у працы ён і ў барацьбе.
Ён аб будучым дбае,
Аб часе, калі
Комуністамі будуць
Усе на зямлі...
Сёння ён — будаўнік,
Дбае ён аб адным,
Каб служылі турбіны
І нашчадкам тым.
Недарэмна ён дбае,
працуе, як след,
Каля сэрца трымае
партыйны білет.
Партбілет — гэта паспарт яго,
Па якім
Ён даўно ўжо
Прапісаны ў будучым тым.

Дзень мінуў, як мільгнуў,
Ноч мінула даўно.
Адчыніў з перамогай
Я насцеж вакно.
Спіць Шайпак. Спіць і Зося,
Не знае яна,
Што рака больш не будзе
Плысці ля вакна.
Паплыве яна рэчышчам
Новым зусім,
А пясчанае дно яе
Стане сухім.
Знаць не знае вярба
Аб прыгодзе такой,
Што стаяць больш не будзе
Яна над вадой.
Мост не знае таксама —
Адкуль яму знаць,—
Што не будзе Пятлянка
Пад ім булькатаць.
Гэта ўсё аднаму мне
Вядома, відно.
Нібы ў заўтрашні дзень
Адчыніў я вакно.
За вакном на вярбе
Не шалохнецца ліст,
Ранак доўгачаканы
І чыст і празрыст,
І мне радасна ведаць,
Што я — комуніст.

Сімфаньета М. Чуркіна

* *
Р. ПУКСТ
* *

Гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) аб оперы «Вялікая дружба» паставіла перад усімі творчымі работнікамі музычнага мастацтва задачы па стварэнню высокаідэйных музычных твораў, глыбока прасякнутых народнасцю.

Поруч з гэтым паўстае неабходнасць шырокай папулярызацыі і прапаганды музычных твораў, якія заваявалі сабе поспех у шырокага слухача.

Адным з такіх твораў трэба лічыць сімфаньету беларускага кампазітара М. Чуркіна. Поспех гэтага твора абумоўлены простымі і разам з тым выразнымі сродкамі гарманічнага і паліфанічнага мыслення кампазітара, які ва ўсіх сваіх творах буйнай і малой формы заўсёды ідзе ад народнай мелодыі.

У аснове музычнай творчасці кампазітара ляжыць народная песня, якую ён апрацоўвае, шліфуе і тым самым узбагачае яе мелодыю.

Музычную адукацыю М. Чуркін атрымаў у Тыфліскім музычным вучылішчы ў вядомага рускага кампазітара Іпалітава-Іванава. У яго вывучаў Чуркін тэорыю музыкі, паліфанію і музычныя формы. За сваё творчае жыццё, якое перавышае палову стагоддзя, Чуркін напісаў велізарную колькасць музычных твораў у розных жанрах. Але ў яго творчасці пераважаюць вакальныя і харавыя творы. Вялікую ўвагу кампазітар аддаваў запісу песеннага фальклора. Ім запісана больш 2000 беларускіх народных песень.

Ствараючы сімфаньету, М. Чуркін паставіў перад сабой задачу—знайсці больш дасканалыя музычныя формы твора, у якім можна было-б выкарыстаць найбольшую колькасць народных беларускіх песень і тым самым адыйсці ад распаўсюджанай формы папуры — твора, у якім некалькі тэм злучаюцца часта механічна, без унутранай арганічнай сувязі.

Ці ўдалося кампазітару вырашыць гэтую задачу? Можна з упэўненасцю сказаць, што сімфаньета М. Чуркіна зрабілася адным з самых папулярных музычных твораў, які ўяўляе вялікую каштоўнасць, таму што ў ім вельмі яскрава выяўлены нацыянальны беларускі каларыт.

Сімфаньету Чуркін напісаў у 1925—26 г. г. Упершыню яна была выканана ў Магілеве ў 1928 годзе аб'яднаным сімфанічным аркестрам музычнай школы, кіно і драматычнага тэатра пад кіраўніцтвам самога аўтара. У 1935 годзе, на творчым канцэрце М. Чуркіна ў Мінску, сімфаньета выконвалася ў другі раз пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР А. Бясмертнага.

У 1937 годзе сімфаньета была запісана на грамафонныя пласцінкі і з таго часу часта перадаецца па радыё з Мінска і Масквы. У час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 годзе першая і чацвертая яе часткі выконваліся ў заключным канцэрце ў Вялікім оперным тэатры БССР.

У 1945 годзе М. Чуркін па прапанове Беларускай дзяржаўнай філармоніі аднаўляе сімфаньету, партытура якой загінула ў час вайны. У новай рэдакцыі аўтар зрабіў сімфаньету для вялікага сімфанічнага аркестра.

Кампазітар М. М. Чуркін

Кіраўнік беларускага дзяржаўнага аркестра народных інструментаў, заслужаны артыст БССР І. Жыновіч пераклаў сімфаньету для аркестра народных інструментаў. На плянарным сходзе беларускіх кампазітараў у 1947 годзе сімфаньета выконвалася пад кіраўніцтвам Т. Каламійцавай. Кампазітары Масквы і братніх рэспублік далі высокую ацэнку сімфаньеце і выказалі пажаданне пазнаёміць шырокія колы працоўных з гэтым характэрным беларускім творам. Рэалізаваць гэтае пажаданне, на жаль, не ўдаецца, таму што пытанні музычнага выдавецтва ў нас, у Беларусі, вырашаюцца яшчэ ў недастатковай ступені, а надрукаванне такога твора вельмі неабходна.

У сваім творы кампазітар выкарыстаў пятнаццаць беларускіх народных песень са зборніка «Беларускія народныя песні», складзенага Раманавым і Чуркіным (том VI). Сімфаньета мае чатыры часткі.

У першай частцы (алегра) у якасці галоўнай і пабочных тэм выкарыстаны беларускія народныя песні: «Расплакаўся юнак», «Устану я раненька», лірычныя песні: «О, не кукуй, зязюленька» і «Дзіцё маё дарагое». Распрацоўка гэтых песень зроблена з вялікім майстэрствам.

Спакойна-разважлівы характар другой часткі сімфаньеты характарызуецца народнымі песнямі «Аддалі мяне замуж» і «Ты, зязюля, не кукуй».

Трэцяя частка сімфоніі — скерца — «жарт». У вясёлай і гуллівай музыцы гэтай часткі выкарыстаны гумарыстычныя вясельныя песні «Ішла, пайшла малада» і «Чачы, чачы верабей». Асаблівую цікавасць уяўляе сярэдняя тэма— «А ў бару сасонка калыхалась». Гэта песня праведзена кампазітарам з вялікім паліфанічным майстэрствам. Неабходна адзначыць вялікую вынаходлівасць кампазітара, які правёў тэму ў люстэркавым адлюстраванні, удала выкарыстаў канон, імітацыю і г. д.

Чацвертая частка, якая найбольш часта выконваецца ў канцэртах, называецца фіналам. Характар музыкі гэтай часткі сцвярджальны, ясны. У якасці галоўнай тэмы праводзіцца вядомая гуллівая песня «Пайшоў Ясь наш на лужок» і далей, як кантраст, гучаць мінорныя песні «У майго браціткі» і «Я ўчора была». Заканчваецца фінал разгорнутым урачыстым правядзеннем галоўнай тэмы ва ўсіх інструментальных галасах.

Праграмнасці ў сімфаньеце няма, няма таксама канкрэтнай сюжэтнай канвы, але ўдала выкарыстаныя народныя песні ствараюць уражанне народных сцэн, у якіх жывуць персанажы сельскага побыту, дзе мільгаюць малюнкі народнага гуляння і вобразы цудоўнай беларускай прыроды.

Шырокае выкарыстанне кампазітарам беларускага песеннага фальклору ў сімфаньеце было выклікана імкненнем стварыць буйнае сімфанічнае палатно, у якім беларуская народная песня, дзякуючы майстэрскай апрацоўцы, найбольш яскрава выявіла-б свае прывабныя якасці і ўласцівасці.

Прастата і даходлівасць—стылявыя адзнакі музыкі М. Чуркіна. Яны вынікаюць з таго, што кампазітар у сваёй творчай музычнай і грамадскай дзейнасці ўвесь час быў шчыльна звязаны з шырокімі працоўнымі масамі. Адсюль імкненне даць у сваіх музычных творах даступную выразную мелодыю, блізкую нашаму народу.

Сімфаньета М. Чуркіна — выдатны музычны твор, які ўвайшоў у творчы актыў совецкай музыкі, заваяваў шырокае прызнанне і любоў совецкага слухача.

На параходзе „Янка Купала“

Шпарка бягуць хвалі глыбокай Бярозы. Яркі жнівеньскі дзень. Каля дамбы Барысаўскай прыстані, крыху пагойдваючыся на бліскучай вадзе, стаіць блакітны параход, які носіць імя народнага паэта. Уночы ён вярнуўся са свайго звычайнага рэйса: Бабруйск—Барысаў, прывёз вясёлую грамаду піонераў—экскурсію, арганізаваную Бабруйскім домам піонераў.

Па гэтым шляху параход хадзіў і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Нямецкія акупанты зрабілі спробу выкарыстаць яго для сваіх перавозак. Каб не дапусціць гэтага, партызаны падарвалі параход, і ён быў затоплены аж да 1944 г. Пасля пад'ёму і рамонту ў 1945 г. параход зноў распачаў навігацыйныя рэйсы.

18 жніўня адбылася сустрэча каманды парахода з дырэктарам музея Янкі Купалы В. Ф. Луцэвіч. Музей прыслаў на параход тры вітрыны, якія адлюстроўваюць асноўныя этапы жыцця, творчасці і грамадскай дзейнасці Янкі Купалы. Апрача гэтага, каманда парахода атрымала ў падарунак невялічкую бібліятэчку.

Кароткі даклад аб жыцці і творчасці Янкі Купалы прачытаў вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР М. Суднік.

Намеснік камандзіра парахода т. Рыбнікаў пазнаёміў прысутных з гісторыяй парахода і спыніўся на працы каманды, намаганнямі якой месячны план перавозак выконваецца на 140 процантаў.

Прысутныя цёпла сустрэлі В. Ф. Луцэвіч. Яна падрабязна расказала аб арганізацыі музея і той культурнай працы, якая ў ім праводзіцца.

Пасля чытання твораў Янкі Купалы, Максім Лужанін прачытаў верш, прысвечаны памяці паэта.

г. Барысаў.
(Наш кар.).

Агітбрыгады мастацкай самадзейнасці

У час уборачнай кампаніі і здачы збожжанарыхтовак дзяржаве агітбрыгада Ашмянскага раённага Дома культуры наведала калгас «17 верасня», а таксама вёскі Маствіліскага, Куцэвіцкага, Гальшанскага сельсоветаў і арганізавала канцэртныя выступленні.

Пры Кушлянскай хаце-чытальні, Смаргоньскага раёна, наладжана работа гурткоў мастацкай самадзейнасці — драматычнага, харавога, танцавальнага і іншых.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці арганізавалі агітбрыгаду ў складзе 15 чалавек. Гэта брыгада выступіла з канцэртамі ў калгасе імя Сталіна і ў вёсках Горцы, Стрыпуні, Несцяляты. У праграме канцэртаў — песні совецкіх кампазітараў: Кантата аб Сталіне, «Бывайце здаровы», «Мы — беларусы» і іншыя.

Наш кар.

Саранск. Дом Совецкаў Мардоўскай АССР.

Фота М. Клімянкова (фотахроніка ТАСС).

Кнігі не даходзяць да чытача

Да кнігі, як да яснага сонечнага промня, імкнецца наш совецкі чалавек. У ёй ён знаходзіць водгук сваім думкам, па ёй ён пазнае законы развіцця грамадства, вучыцца ў герояў кніг жыць, быць карысным сваёй Радзіме.

З кожным годам павялічваюцца тыражы выпускаемай літаратуры. Дастаткова сказаць, што ўжо ў 1947 годзе Дзяржаўнае выдавецтва БССР па тыражу кніг дасягнула даваеннага ўзроўню.

Аднак, выдаць добрую і карысную кнігу — адзін бок справы. Не менш важнай задачай з'яўляецца распаўсюдзіць кнігу сярод шырокіх працоўных мас. Для гэтай мэты існуе рад гандлёвых арганізацый, Рэспубліканскі бібкалектар БССР, які забяспечвае ўсе абласныя, гарадскія і раённыя бібліятэкі, парткабінеты, педкабінеты, хаты-чытальні, а таксама бібліятэкі сярэдніх школ, тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў.

Азнаямленне з дзейнасцю Рэспубліканскага бібкалектара БССР паказала, што ўкамплектаванне кнігамі бібліятэк рэспублікі патрабуе многа лепшага. Аб гэтым гаворыць і той факт, што бібкалектар за 6 месяцаў гэтага года распаўсюдзіў кніг толькі на 1.400 тысяч рублёў, замест запланаваных 2,5 мільёна рублёў. На складах бібкалектара ляжаць без усялякага руху сотні тысяч кніг на агульную суму каля 1 мільёна рублёў. Са складаў Дзяржаўнага выдавецтва БССР не вывезена 27.890 кніг на суму 138.747 рублёў.

Чаму стварылася такое непрыгляднае становішча? Чаму беларуская кніга марудна ідзе да чытачоў? Выяўляецца даволі сумная карціна. Справа ў тым, што вялікая колькасць абласных, гарадскіх і раённых бібліятэк дрэнна камплектуюцца, не гледзячы на тое, што з Дзяржаўным бібкалектарам БССР яны заключылі ўмовы на набыццё літаратуры.

Так, Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна павінна набыць у гэтым годзе кніг на 60 тысяч рублёў. За сем месяцаў яна набыла кніг толькі на 9 тысяч рублёў. Загадчык гэтай бібліятэкі тав. Бобрык яўна недаацэньвае справу камплектавання бібліятэкі.

Вельмі марудна павялічвае кніжны фонд Гродзенская абласная бібліятэка.

Яшчэ горш працуюць гарадскія і раённыя бібліятэкі. Так, бібліятэка Васілевіцкага раёна павінна была закупіць у гэтым годзе кніг на 9 тысяч рублёў. Але да сёнешняга дня не закуплена ніводнай кнігі. Такое-ж становішча ў Асіпавіцкай, Жыткавіцкай і іншых райбібліятэках.

Зусім недапушчальным з'яўляецца той факт, што з існуючых 542 бібліятэк сярэдніх школ камплектуецца больш-менш добра толькі 60. Астатнія — зусім не набываюць кніг. У гэтым, у першую чаргу, віноўна Міністэрства Асветы БССР. Яно пакінула па-за ўвагай гэта надзвычай важнае пытанне. А таму ў большасці школ рэспублікі вучні не маюць магчымасці знаёміцца з навінкамі совецкай літаратуры.

Тым не менш, не ўсе бібліятэкі працуюць дрэнна. Маладзечанская абласная бібліятэка закупіла за паўгоддзе кніг на суму 28.000 рублёў, перавысіўшы запланаваную суму на 5 тысяч рублёў. Выдатна працуюць Калінкавіцкая і Капаткевіцкая бібліятэкі. Яны ўжо набылі літаратуры на ўсю суму, якая запланавана ім на гэты год.

Са станоўчага боку трэба адзначыць работу некаторых абласных і раённых культасветаддзелаў, задачай якіх з'яўляецца забяспечанне хат-чытальняў мастацкай і палітычнай літаратурай. Так, для хат-чытальняў Магілеўскай вобласці набыта кніг на 60 тысяч рублёў, для Несвіжскага раёна — на 10 тысяч рублёў, для Ганцавіцкага раёна — на 15 тысяч рублёў.

Добра вылучаюцца па ўкамплектаванню сваіх кніжных фондаў і некаторыя бібліятэкі Мінскіх сярэдніх школ № 21, 28 і 42, Мір-Турэцкая СШ Баранавіцкай вобласці і іншыя.

За дрэннае распаўсюджванне кнігі вялікая адказнасць ляжыць і на Кіраўніцтве рэспубліканскім бібкалектарам БССР. Іншы раз для гарадскіх і абласных бібліятэк высылаецца літаратура, якая ёсць у дастатковай колькасці на месцы. Нездарма Бабруйская гарадская бібліятэка (загадчык тав. Зорына) адмовілася ў гэтым месяцы прыняць кнігі ў колькасці чатырох пасылак на суму 1.000 рублёў, бо там былі такія кнігі, якія бібліятэка закупіла раней.

Гэта гаворыць аб тым, што бібкалектар не ведае запатрабавання бібліятэк.

Кожны месяц бібкалектар павінен праводзіць не менш двух нарад загадчыкаў гарадскіх бібліятэк рэспублікі, на якіх павінны ставіцца найбольш важныя пытанні бібліятэчнай работы. Але, на жаль, такія нарады—рэдкая з'ява. Прапагандай навінак совецкай літаратуры ніхто не займаецца. У пачатку гэтага года дырэктар Рэспубліканскага бібкалектара тав. Зарэцкая выязджала ў Баранавіцкую вобласць, дзе асабіста пазнаёмілася са станам гарадской і раённых бібліятэк. Былі праведзены нарады, гутаркі. Тав. Зарэцкая пазнаёміла загадчыкаў бібліятэк з новымі кнігамі, якія ёсць на складах бібкалектара, коратка ахарактарызавала кожную з іх. Пасля такога мерапрыемства бібліятэкі Баранавіцкай вобласці пачалі ў тэрмін выкупляць патрэбную літаратуру, штомесячна даваць новыя заяўкі.

Дырэктару Рэспубліканскага бібкалектара БССР тав. Зарэцкай неабходна было-б зрабіць з гэтага патрэбныя вывады і палепшыць непасрэдную сувязь з раённымі і сельскімі бібліятэкамі.

У наш час, калі ідэйна-палітычнае выхаванне працоўных мас мае надзвычай важнае значэнне, работа па распаўсюджванню кнігі павінна весціся ўсімі даступнымі сродкамі з большэвіцкай напорыстасцю. Аб гэтым не павінны забываць партыйныя і совецкія работнікі рэспубліканскага бібкалектара і кнігагандлюючых арганізацый.

М. ГАМОЛКА.

НОВЫЯ КНІГІ

Максім Горкі — «Маці», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 293 стар. Цана 10 рублёў.

Барыс Гарбатаў — «Непакароныя», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 183 стар. Цана 4 рублі 50 капеек.

П. Паўленка — «Шчасце», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 263 стар. Цана 11 рублёў.

Якуб Колас — «Усход сонца», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 43 стар. Цана 2 рублі 50 капеек.

Кніга афармлена мастаком С. Раманавым.

Анатоль Астрэйка — «Добры дзень», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 191 старонка. Цана 5 руб. 75 капеек.

А. Манусевіч — «Пасляваенная пяцігодка СССР і БССР у дзеянні». Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 77 старонак. Цана 2 рублі.

М. Вішнеўскі — «Еўдакія Кухарава» — нарыс пра Героя Сацыялістычнай Працы. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 23 старонкі. Цана 25 капеек.

Масква. Рачны трамвай на Масква-рацэ ля Дома Урада.
(Фотахроніка ТАСС).

ЛІСТЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Які адрас Мінскага мастацкага вучылішча?

У канцы мінулага году ў Мінску было арганізавана мастацкае вучылішча.

Маладым мастакам давялося працаваць увесь год у цяжкіх умовах, таму, што вучылішча свайго памяшкання не мае, а часова займала класы школы № 6 па Лагойскаму тракту.

Але і гэтага памяшкання вучылішча з 1 ліпеня 1948 года пазбавілася.

Заняткі па малюнку адбываліся ў пачатку навучальнага года часта пры газавай лямпе; студэнты сядзелі за дзіцячымі партамі. Спецыяльнай аўдыторыі для заняткаў па малюнку і жывапісу не было (а працаваць са студэнтамі пры электраасвятленні — нельга), і заняткі па гэтых дысцыплінах пачаліся толькі ў студзені 1948 г.

Днём у школе вучыліся дзеці, а пасля іх класы займалі студэнты мастацкага вучылішча.

Кожны дзень прыходзілася ставіць і прыбіраць нацюрморты, таму што большасць пакояў былі праходнымі. Пакоі ўсе малыя па размеру, столь вельмі нізкая.

Зразумела, што ў такіх неадпаведных умовах вельмі цяжка навучыць студэнтаў мінімальным прафесійным навыкам мастака.

У сучасны момант вучылішча мае патрэбу ў шасці аўдыторыях для заняткаў па спецыяльнасці і агульнаадукацыйных дысцыплінах і ў габінетах па пластычнай анатоміі і перспектыве. Патрэбны пакоі для бібліятэкі, метадычнага фонда, настаўніцкай і канцылярыі. Але для мастацкага вучылішча — адзінага на Беларусі — «пакуль што» няма памяшкання. Быў час, калі студэнты Мінскага мастацкага вучылішча па агульнаадукацыйных дысцыплінах займаліся ў будынку вышэйпамянёнай школы, а заняткі па малюнку адбываліся ў двух невялікіх пакойчыках у памяшканні Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

Ні разу на працягу навучальнага года ў вучылішча не заглянуў ніхто з вядучых мастакоў і скульптараў Беларусі. Мабыць, не было часу тав. Ахрэмчыку. Не палічылі патрэбным зрабіць гэта і таварышы Азгур Керзін. Зусім забыўся пра вучылішча тав. Зайцаў і іншыя.

Жыццё мастацкага вучылішча ішло сваім парадкам, у баку ад іх дапамогі.

І ўсё-ж, не гледзячы на дрэнныя ўмовы навучання, у мастацкім вучылішчы да канца мінулага навучальнага года выявілася шмат таленавітай моладзі, якая ў іншых, больш спрыяльных умовах, магла-б дасягнуць значна лепшых поспехаў.

Патрэбна адзначыць выключныя клопаты аб студэнтах і самаадданую працу педагагічнага калектыва вучылішча, які не дарма працаваў ў мінулым навучальным годзе над выхаваннем маладых кадраў выяўленчага мастацтва.

Калі надыйдзе зіма — будзе позна займацца пытаннямі аб памяшканні для мастацкага вучылішча, інтэрнаце для студэнтаў, укамплектаваннем штата і г. д.

Р. МІХАЙЛАЎ.

Палепшыць работу з пачынаючымі

Літаратурнае аб'яднанне пачынаючых пісьменнікаў пры абласной газеце «Гомельская праўда» існуе ўжо два гады. За гэты час праведзена значная работа. Два разы ў месяц збіраліся ў рэдакцыі газеты члены літаб'яднання для абмеркавання сваіх твораў, абмяркоўваліся планы літстаронак. Члены літаб'яднання выступалі з чытаннем твораў па радыё і ў клубах горада. Даволі часта ў газеце выходзіла літстаронка, дзе змяшчаліся вершы, апавяданні і нарысы, рэгулярна ў газеце вёўся аддзел крытыкі і бібліяграфіі.

Рост пачынаючых пісьменнікаў быў відавочны. Член літаб'яднання Іван Шамякін у мінулым годзе быў прыняты ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, члены літаб'яднання — Міхась Даніленка, Іван Юрчанка, Нікіфар Парукаў, Янка Тулупаў, Леанід Райскі, Барыс Лунькоў, В. Дадзіёмаў і інш. пачалі друкавацца не толькі ў абласной газеце, але і рэспубліканскіх часопісах і газетах.

За апошнія-ж шэсць месяцаў абласная газета не арганізавала ніводнай літстаронкі. З гэтай прычыны некаторыя пачынаючыя пісьменнікі Гомельшчыны перасталі прысылаць у газету свае творы. Літаб'яднанне ўжо два месяцы не вядзе ніякай работы.

Чаму так здарылася?

Па-першае, таму, што работнікі рэдакцыі на творы пачынаючых глядзяць як на непатрэбны асартымент і, спасылаючыся на розныя «аб'ектыўныя» ўмовы, выцясняюць літаратурны матэрыял з газеты.

Па-другое, літаб'яднанне не атрымоўвае дапамогі з боку праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Доўгі час у Гомель не прыязджаюць брыгады пісьменнікаў. Надзвычай слаба ажыццяўляюцца Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР і пісьмовая сувязь з літаб'яднаннем.

Безумоўна, усе гэтыя акалічнасці не садзейнічаюць творчаму росту маладых пісьменнікаў, разгортванню літаратурнага руху ў вобласці.

Хочацца думаць, што праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР неадкладна дапаможа наладзіць работу літаратурнага аб'яднання пры газеце «Гомельская праўда».

М. КАРПАЧОЎ.

Шырэй распаўсюджваць часопісы і газеты

Таварыш Сталін на XII з'ездзе партыі ў 1923 годзе гаварыў: «Друк павінен расці не па днях, а па гадзінах,—гэта самая войстрая і самая моцная зброя нашай партыі».

Гістарычныя ўказанні правадыра поўнасцю здзейснены. У нашай краіне выдаецца столькі газет і часопісаў, як нідзе ў другой краіне свету. Газеты і часопісы адыгрываюць вялікую ролю ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці, друкаванае слова пранікла да самых шырокіх мас. Праз друк комуністычная партыя штодзённа, штохвілінна размаўляе з совецкім народам, кліча яго да новых працоўных поспехаў, выхоўвае ў совецкіх людзях любоў да Радзімы, жыватворчы совецкі патрыятызм.

Надзвычай важна, каб кожны экземпляр выдаваемых газет і часопісаў даходзіў да чытача, не прападаў дарэмна.

У першай палове гэтага года на тэрыторыі БССР было распаўсюджана па падпісцы газет і часопісаў на суму 19 мільёнаў 518 тысяч рублёў. А прадана па рознічнай рэалізацыі на суму 8 мільёнаў 680 тысяч рублёў. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе.

Між тым, нельга пакуль задаволіцца работай органаў «Саюздруку». Ёсць рад фактаў, якія гавораць пра тое, што ў многіх гарадскіх і сельскіх мясцовасцях не наладжана як след дастаўка і распаўсюджанне перыядычных выданняў сярод насельніцтва. Так, на жнівень месяц план распаўсюджання рэспубліканскіх газет не выканан. Замест запланаваных 340 тысяч экземпляраў у парадку падпіскі, распаўсюджана толькі 290 тысяч. Асабліва дрэнна абстаіць справа з падпіскай на газеты «Чырвоная змена» і «Совецкі селянін». «Чырвоная змена», якая выдаецца тыражом у 40 тысяч экземпляраў, мае падпісчыкаў усяго толькі 18.900. Большая частка тыража ідзе праз кіёскі ў продаж і выкарыстоўваецца, у пераважнай большасці, не па прызначэнню.

Яшчэ горш абстаіць справа з распаўсюджаннем абласных і раённых газет. Так, у Пінскай вобласці на жнівень месяц план падпіскі на абласную газету выканан толькі на 37 процантаў, а на раённыя — на 35%. Не лепшае становішча ў Баранавіцкай, Гродзенскай і іншых абласцях. Гэтыя факты гавораць аб тым, што работнікі «Саюздруку» і кантор сувязі не ўяснілі поўнасцю важнасці ўскладзеных на іх абавязкаў. Аб гэтым сведчаць пісьмы, якія паступаюць ад рабочых і калгаснікаў. З Сакаўскага сельскага совета, Маладзечанскай вобласці паведамляюць, што з 13 населеных пунктаў у васьмі няма ніводнага падпісчыка на перыядычныя выданні. А тым, хто выпісаў газеты, даводзіцца асабіста хадзіць за 5—12 кілометраў, каб іх атрымоўваць, таму што дастаўка зусім не наладжана. Загадчык агенцтвам сувязі Сакаўскага сельсавета Гаспарэвіч ніякай работы па распаўсюджванню газет і часопісаў сярод насельніцтва не вядзе і нават не лічыць гэта сваім першачарговым абавязкам. Не лепш працуюць і загадчыкі іншых сельскіх агенцтваў і кантор сувязі. Рэспубліканскі аддзел «Саюздруку» прыняў рад мерапрыемстваў па палепшанню распаўсюджання друку і павелічэнню індывідуальнай падпіскі. 18 ліпеня быў праведзен па ўсёй рэспубліцы нядзельнік па шырокаму ахопу падпіскай усіх слаёў насельніцтва. У нядзельніку прынялі ўдзел 5.100 комсамольцаў і несаюзнай моладзі і звыш 3.800 работнікаў сувязі.

Гэтае мерапрыемства дало нядрэнныя вынікі. За адзін дзень была сабрана падпіска на 3.600 экземпляраў рознастайных перыядычных выданняў. Асабліва добра правялі нядзельнік у Гомельскай і Полацкай абласцях, дзе падпіскай былі ахоплены дадаткова 15.000 чалавек.

Месяц назад кіраўніцтва Упаўнаважанага міністэрства сувязі СССР пры Совеце Міністраў БССР аб'явіла аб правядзенні рэспубліканскага агляду работы па распаўсюджванню і дастаўцы друку на перыяд ліпень—жнівень — верасень месяцы 1948 года. Гэты агляд мае на мэце сур'ёзна палепшыць работу органаў «Саюздруку» і кантор сувязі. Для лепшых работнікаў, выяўленых у часе гэтага агляду, устаноўлены нават заахвочваючыя прэміі. Але прайшоўшы месяц гаворыць аб тым, што такое добрае мерапрыемства зрываецца, не праводзіцца ў жыццё. І сапраўды, рэспубліканская аглядная камісія павінна была падвесці вынік агляду і прысудзіць прэміі лепшым работнікам сувязі к 15 жніўня. Даўно прайшоў вызначаны тэрмін, а камісія бяздзейнічае.

Непрыемным трэба лічыць яшчэ і той факт, што не гледзячы на ўсе мерапрыемствы па палепшанню распаўсюджвання газет і часопісаў начальнік рэспубліканскага аддзела «Саюздруку» тав. Ігнатовіч сам мала зацікаўлены ў гэтым. Чым-жа другім вытлумачыць тое, што на складах Дзяржаўнага выдавецтва БССР ляжаць да гэтага часу на суму 159 тысяч рублёў дзесяткі тысяч кніг, прызначаных для «Саюздруку»?

«Саюздрук» адмаўляецца таксама ад распаўсюджвання многіх часопісаў. На складах ляжыць яшчэ часопіс «Полымя» № 1 і № 3 у колькасці 1.858 экземпляраў і «Вожык» № 11 у колькасці 1636 экземпляраў. Яны ўжо ўстарэлі, іх нельга прадаць. Так кнігі і часопісы з-за непаваротлівасці рэспубліканскага аддзела «Саюздруку» ператвараюцца ў макулатуру.

Трэба пакончыць з такім становішчам і неадкладна прыняць усе намаганні, каб шырока распаўсюдзіць газеты і часопісы.

М. МАЗЫРСКІ.

П. ГЕРАСІМОВІЧ

Да пытання гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва

Пытанні, закранутыя ў артыкуле народнага мастака БССР В. Бялыніцкага-Бірулі, не могуць не хваляваць усіх тых, хто шчыра адданы свайму народу, сапраўды любіць створанае ім мастацтва. Беларускі народ, які не адзін раз у сваёй гісторыі пакрыў сябе неўміручай славай, пачынаючы ад далёкіх часоў нашэсця на нашу краіну нямецкіх псоў-рыцараў, шведскіх і польскіх навал і кончаючы незабыўнымі днямі Вялікай Айчыннай вайны, такі народ не мог не мець свайго мастацтва, што ўвасабляла яго духоўную сілу і моц, яго жыццездольнасць.

На працягу ўсёй шматгадовай гісторыі з беларускага народа выходзілі выдатныя майстры мастацтва, дзеячы культуры і навукі.

Багацейшыя здабыткі мастацтва і культуры нашага народа альбо загінулі і не дайшлі да нашага часу па цэламу раду прычын гістарычнага і сацыяльнага характару, альбо дрэнна захаваліся і слаба даследаваны, не сістэматызаваны нашай маладой мастацтвазнаўчай навукай, ці прадстаўлены ў скажоным выглядзе. Да нашага часу захаваліся выдатныя помнікі архітэктуры: полацкі Сафійскі сабор, пабудаваны ў XI стагоддзі, сабор Спаса-Еўфрасініеўскага манастыра XII стагоддзя, царква Благавешчання ў Віцебску, Каложская царква ў Гродні. Сцены гэтых архітэктурных помнікаў былі ўпрыгожаны выдатнымі фрэскамі і ўзорнымі мазаічнымі творамі. З матэрыялаў нашых мастацтвазнаўцаў, сабраных у час апошняй экспедыцыі па Беларусі, відаць, што старажытны жывапіс на сценах гэтых архітэктурных помнікаў захаваўся толькі часткова і то замаляваны пазнейшымі майстрамі; ён патрабуе грунтоўнай рэстаўрацыі.

У XIII стагоддзі ў час княжання Уладзіміра Васількавіча (1272 — 1289 г. г.) славіўся мастак і зодчы Алешка (Алёкса), у XV стагоддзі было шырока вядома імя выдатнага зодчага Ярмоліна Васілія Змітравіча, які праславіўся на пабудовах Крэмлёўскіх сцен і пабудове Успенскага сабора ў Маскоўскім Крэмлі (1471 г.).

Шмат гадоў пазней, у XIX стагоддзі, працавалі славутыя жывапісцы С. Заранка, А. Гараўскі, Н. Сіліваповіч, Л. Асіназіі, бліскучы скульптар І. Шрэдэр. Нарэшце канец XIX стагоддзя і XX стагоддзе далі нам нашага старэйшага народнага мастака БССР В. Бялыніцкага-Бірулю і мастакоў: М. Керзіна, В. Волкава, двойчы лаўрэата Сталінскай прэміі З. Азгура і рад іншых таленавітых майстроў, творчасць якіх расквітнела на лепшых узорах мастацтва нашых суайчыннікаў.

Не толькі старажытнае мастацтва, але і тое, якое добра захавалася (уключаючы сюды і сучаснае совецкае мастацтва), не знайшло пакуль што сваіх гісторыкаў і даследчыкаў. Выпадковыя артыкулы, прысвечаныя беларускаму выяўленчаму мастацтву, надрукаваныя ў перыядычным друку альбо выпушчаныя асобнымі выданнямі, у большасці сваёй павярхоўныя, ці маюць шкодныя сцвярджэнні. Шмат заган знаходзім мы ў артыкуле Н. Машкаўцава, надрукаваным у зборніку «Изобразительное искусство Белоруссии», выданым Дзяржвыдавецтвам у 1940 годзе, і ў артыкуле О. Бескіна, змешчаным у часопісу «Искусство» № 6, 1940 г.

Н. Машкаўцаў і О. Бескін фальсіфіцыруюць пытанне гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва, беспадстаўна абядняюць яго. Адмаўляючы існаванне ў дарэволюцыйнай Беларусі выяўленчага мастацтва, яны, тым самым, сцвярджаюць духоўную беднасць беларускага народа, які быццам-бы не здолеў у мінулым стварыць сваю ўласную культуру і мастацтва. Гэтыя шкодныя, антынародныя канцэпцыі мяжуюцца з думкай аб другараднай нацыянальнай годнасці нашага народа.

У артыкуле Н. Машкаўцава гаворыцца: «У гісторыі мастацкай культуры Беларусі станкавы жывапіс— з'ява новая. Толькі ў XIX стагоддзі Беларусь вылучыла некалькі жывапісцаў, але агульныя палітычныя ўмовы, створаныя царскім рэжымам для «акраіны» вялікарускай дзяржавы—Беларусі, прымушалі мастакоў шукаць шчасця за яе межамі, рабілі немагчымым узнікненне нацыянальнай мастацкай школы».

Н. Машкаўцаў, а ўслед за ім і О. Бескін, сцвярджаюць, што толькі трох мастакоў—Ю. Пэна, Л. Альперовіча, Я. Кругера можна лічыць піянерамі беларускага прафесіянальнага жывапісу. Мы нічога не маем супроць гэтых сумленных мастакоў, якія зрабілі ўсё, што здолелі, для беларускага выяўленчага мастацтва. Аднак нельга сцвярджаць таго, што не мае пад сабою рэальнай глебы.

Беларускі народ знаходзіўся да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі пад двайным уціскам: з боку сваіх уласных паноў і капіталістаў і з боку царскага самаўладства. Пад такім прыгнётам знаходзіўся украінскі народ і іншыя народы царскай Расіі. І ўсё-ж, не гледзячы на цяжкі лёс, заняволеныя беларускі і украінскі і іншыя народы мелі сваіх выдатных сыноў. Нават у самыя змрочныя часы з народа выходзілі вялікія дзеячы.

Чаму-ж тады беларускі народ нездольны быў мець сваіх дзеячоў мастацтва і, па думцы Н. Машкаўцава і О. Бескіна, знаходзіўся ў стане нейкага анабіоза?

Геніяльныя мастакі Рэпін, Сурыкаў, Антакольскі, Левітан і іншыя выдатныя дзеячы мастацтва і культуры выйшлі з народных нізоў у цяжкія гады. Гэтая акалічнасць дазваляе сцвярджаць непераможнасць народа, яго неўміручасць. Ніякая сіла не здольна перамагчы народ і тое перадавое і лепшае, што ёсць у ім.

Беларускі народ, як і вялікі рускі народ, мае сваіх выдатных зодчых, мастакоў, пісьменнікаў, вучоных, і гісторыя нашага совецкага мастацтва, самага ідэйнага і перадавога ў свеце, бярэ свой пачатак з тых старажытных часоў, калі ўпершыню ў народзе нарадзіліся песні і казкі, цесляры, ганчары, рэзчыкі па дрэву, ткачы і граверы.

Уся справа ў тым, наколькі глыбока вывучана гэтая гісторыя. Нявырашаным да гэтага часу застаецца пытанне нацыянальнай прыналежнасці такіх буйных мастакоў, як Сіліваповіч, Заранка, Пігулеўскі, Гараўскі, Шрэдэр, Багданаў-Бельскі і некаторых іншых мастакоў, творчая дзейнасць якіх доўгі час праходзіла па-за межамі Беларусі, у буйнейшых гарадах Расіі.

Паміж вялікім рускім і беларускім народам заўсёды існавалі прыязныя адносіны; якая-б варожая нага ні ступала на землі гэтых народаў, змаганне вялося сумесна. Расла і ўмацоўвалася руская дзяржава, расла і багацела культура і мастацтва рускага народа, мацнела і дружба паміж двума народамі, мацнеў уплыў рускага народа на свайго малодшага брата—беларускі народ.

У нашую шчаслівую эпоху, дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы, гэтая дружба паміж двума народамі стала непарыўнай на ўсё жыццё; велізарная культурная і мастацкая спадчына рускага народа і ў нашы дні служыць узорам для пераймання. Лепшыя майстры беларускага мастацтва атрымоўвалі і атрымоўваюць сваю асвету ў Акадэміі мастацтва: Н. Сіліваповіч, Л. Пігулеўскі, С. Заранка, А. Гараўскі, Н. Шрэдэр, Ю. Пэн, Л. Альперовіч, Я. Кругер, сучасныя мастакі: М. Керзін, В. Волкаў, З. Азгур, А. Бембель, Я. Зайцаў, Г. Паўлоўскі, А. Шыбнёў, Х. Ліўшыц, В. Хрусталёў. З маскоўскага мастацкага інстытута вышлі: М. Багданаў-Бельскі, В. Бялыніцкі-Біруля, І. Ахрэмчык, В. Цвірко, М. Белянінцкі, А. Шэўчэнка, М. Філіповіч, В. Сухаверхаў, І. Гембіцкі, М. Гусеў, Б. Басаў і інш.

Глыбокая прыязнь, шчырасць ва ўзаемаадносінах гэтых двух народаў з выключнай выразнасцю выявілася ў цяжкія дні Вялікай Айчыннай вайны; як два родныя браты абаранялі яны дарагую Маскву, Сталінград, разам узнімалі пераможны сцяг над павержаным Берлінам. Беларускія мастакі, гасцінна прынятыя ў дні вайны ў майстэрні рускімі мастакамі, пісалі творы, змест якіх быў поўны нянавісці да агульнага ворага.

І цяпер, у мірны час, народны мастак БССР З. Азгур паказвае вялікіх сыноў рускага народа, а на палотнах рускіх майстроў мы бачым легендарных беларускіх партызанаў, герояў калгасных палёў. Совецкі глядач з аднолькавай цікавасцю ўспрыймае гэтыя творы.

Настаўнік пачатковай школы з Палесся і сяржант Совецкай Арміі, праглядзеўшы Трацякоўскую галярэю, пакідаюць свае запісы ў кнізе водгукаў, дзе яны пішуць: «Яшчэ раз пераконваемся, якое цудоўнае мастацтва **нашых** мастакоў: Рэпіна, Сурыкава, Левітана, а таксама Гараўскага і Заранкі».

Лепшыя творы беларускіх мастакоў і цяпер знаходзяцца на выстаўках Масквы, а самыя лепшыя з іх ідуць на папаўненне Трацякоўскай галярэі і іншых музеяў Саюза. Працаваць над пытаннем гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва немагчыма без шчыльнай сувязі з рускімі мастацтвазнаўцамі. Толькі агульнымі намаганнямі можна весці распрацоўку складаных пытанняў гісторыі беларускага мастацтва, неабходнасць якой даўно выклікана самім жыццём і ўсім ходам далейшага развіцця совецкага мастацтва, ростам мастацкіх кадраў. Інстытутам літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР распачата праца па вывучэнню мастацкай спадчыны беларускага народа. Першыя крокі ў гэтым напрамку зроблены Дзяржаўнай Карцінай галярэяй. Паўстала патрэба падагуліць багаты фактычны матэрыял, высветліць усе нявырашаныя пытанні з пункту гледжання перадавога навуковага мышлення, таго глыбокаідэйнага разумення мастацтва, якога патрабуюць пастановы партыі па ідэалагічных пытаннях.

Наша праца павінна быць накіравана на тое, каб напісаць такі падручнік па гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва, у якім працэс яго станаўлення і развіцця, паасобныя этапы яго эвалюцыі і ўсё яно ўвогуле, знайшло належную характарыстыку, дзе было-б выяўлена сапраўднае значэнне і каштоўнасць беларускай мастацкай культуры.

На характэрных прыкладах, з глыбокім аналізам лепшых узораў мастацтва, даследаваць вартасць нашага дарэволюцыйнага і совецкага мастацтва, высветліць, у якой ступені яно выяўляе светапогляд людзей нашай эпохі, сказаць большэвіцкай мовай пра наша айчыннае мастацтва і скласці на гэтай мове яго гісторыю,—з'яўляецца не толькі вялікім гонарам для нашай мастацтвазнаўчай совецкай навукі, але ёсць кроўная яе справа.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА (КРЫСЬКО)—нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА
на газету
„ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА"
на верасень, кастрычнік, лістапад і снежань 1948 года
Падпісная цана:
на 1 месяц — 2 руб. 20 кап.
да канца года — 8 руб. 80 кап.
Падпіска прымаецца ва ўсіх гарадскіх і раённых аддзяленнях „Саюздруку", а ў сельскай мясцовасці—на пошце.

АТ 02315 Адрас рэдакцыі: Мінск, Рэволюцыйная, 3 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэволюцыйная, 12.